Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Гайнаўскі фестываль ☞ 3

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Родны краявід у Саланевіч ☞ 4

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 21 (2819) Год LV | Беласток, 23 мая 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Новая Воля ў Беластоку

— Спадзяюся, што атрымаем запрашэнне і паедзем таксама ў Канаду, — пажартаваў архіепіскап Іакаў, адкрываючы ў мінулую нядзелю ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку выстаўку „Новая Воля папросту".

Выстаўка на шляху ўжо чарговы раз. Раней паказвалася, зразумела, у Новай Волі, Міхалове, Геранімове, Супраслі ды Універсітэце ў Беластоку. У апошняе месца прыехалі нават маладыя ўдзельнікі праекта, дзеці і моладзь з Новай Волі. Не ўдалося раней, аднак, наладзіць афіцыйнага вернісажу ў Беластоку, які падводзіў бы цэлы праект. А самая лепшая нагода — гэта кніжка, якая з'явілася год таму. Раскрывае яна карты жыцця маленькіх грамадстваў Новай Волі на Беласточчыне ды рэзервацыі іракезаў у Канадзе, дзе праект нарадзіўся.

— Калі людзі жывуць у малых, бедных грамадствах, паяўляецца пытанне што для іх абазначае шчасце, — гаварыў запрошаны на вернісаж архіепіскап Іакаў. — Складаецца ўражанне, што яны жывуць у меншым стрэсе, спакайней, пра шмат з'яў не ведаюць і, мабыць, таму падаецца, што яны часам больш шчаслівыя чым жыхары гарадоў. Сёння мы пабачылі як сваё шчасце бачаць наймалодшыя жыхары такіх месцаў.

Дзеці і моладзь, якія сталі героямі праекта, за штодзённым жыццём назіралі пры дапамозе фотаапаратаў, пачутыя ад найстарэйшых жыхароў расказы адлюстроўвалі не толькі на здымках, але і запісвалі іх сваімі словамі. Калі паглядзець на старонкі кніжкі „Новая Воля папросту", здаецца запісана ў ёй усё, што найважнейшае для маладых людзей. Цікава, што час у кніжцы ўніверсалізуецца. Тое, што важнае для дзяцей сёння, не менш важнае было для іх дзядоў, нягледзячы на вялікія змены, якія прынеслі апошнія дзесяцігоддзі.

— Найбольшая вартасць кніжкі ў яе натуральнасці, у тым, што ніводных слоў мы не мянялі, што свет, які малюецца ў кніжцы — сапраўдны, — падкрэсліла Анна Дабравольская з Гміннага асяродка культуры ў Міхалове, арганізатар сустрэчы.

Пасля слоў афіцыйнага адкрыцця мерапрыемства быў час пабачыць не толькі вялікафарматныя здымкі дзяцей, але таксама фотасправаздачу з пасобных частак рэалізацыі праекта. Як гэта бывае, пры такіх нагодах можна было пагаварыць непасрэдна з аўтарам.

— Гэты праект мы рэалізавалі супольна з маёй сяброўкай Аліцыяй Фронь, якая сёння не магла быць тут, у Беластоку, — адзначыў Барташ Глябовіч, даследчык, перакладчык і аўтар гэтай цікавай ідэі. — Аліцыі мы вельмі ўдзячны перш за ўсё за цярплівасць. Былі моманты, калі людзі не вельмі ахвотна хацелі нешта расказаць ці сфатаграфавацца. У такіх момантах Аліцыя доўга і цярпліва тлумачыла нашу задуму, ролю дзяцей і патрэбу іхняга ўдзелу ў праекце.

Аказалася, што ўдзельнікаў вернісажу праект сапраўды ўразіў. Не павінна здзіўляць, што ў сваіх пытаннях праяўлялі яны цікаўнасць да таямнічага свету па другім баку акіяна. Пыталі перад усім пра ўмовы жыцця канадскіх індзейцаў. Ці яны ўсе зараз жывуць у рэзервацыях, чым займаюцца і якога яны веравызнання. Некаторых шчыра здзівіла, што, паводле слоў аўтара праекта Барташа Глябовіча, многія — калі ўжо — то каталікі і пратэстанты. Цікаўнасць да жыцця індзейцаў толькі пацвердзіла вялікае ўражанне, якое выклікаў цэлы праект.

— Чаму ў праекце прымалі ўдзел толькі дзеці ва ўзросце больш-менш 9-12 гадоў? Ці ёсць у Новай Волі гімназія? — пытанні ставіла адна з беластоцкіх студэнтак.

Варта пры нагодзе адзначыць, на што ўвагу звярталі таксама арганізатары сустрэчы, што калі праект пачынаўся ў 2007 годзе, у Новай Волі яшчэ працавала падставовая школа, але яе неўзабавае закрылі па эканамічных прычынах. Аднак, паводле слоў Барташа Глябовіча, удзел дзяцей у праекце быў добраахвотны і гэта яны рашалі як доўга і з якой ангажаванасцю гуляць ім у мясцовых этнографаў.

— Ведаем як бывае з рознага кшталту праектамі. Раз удасца знайсці грошы, часта, на жаль, не. Таму калі такія людзі знойдуцца, з пасіяй, ангажаванасцю, трэба проста рабіць, — дзяліўся ў час вернісажу сваімі думкамі настаяцель прыхода ў Міхалове айцец Іаан Ярашук.

— Больш такіх праектаў, — на завяршэнне афіцыйнай часткі нехта выгукнуў з залы. Пайшлі апладысменты.

Заахвочваў таксама і архіепіскап:

— На такія праекты павінны знаходзіцца грошы ў нашых лакальных бюджэтах.

А напэўна трэба шукаць людзей, якія ідэі гэтага кшталту падтрымлівалі б, тым больш, што кніжка, якая падводзіць праект, запісаная на трох мовах: польскай, беларускай ды англійскай. Тое, што з'яўляецца лакальным, можа мець таксама ўніверсальнае аблічча.

Выстаўку „Новая Воля папросту" можна глядзець у Цэнтры праваслаўнай культуры па вуліцы св. Мікалая 5 у Беластоку да 25 траўня 2010 г.

УВАГА КОНКУРС

XIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група:** дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група:** астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, набраныя на камп'ютары або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 84** з прыпіскай на канверце: XIII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **15 кастрычніка 2010 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў снежні 2010 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Конкурс праводзіцца дзякуючы фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!!!

Расстрэл

У Гродне мала хто ведае, што 14 траўня гэтага года Гродзенскі абласны суд агучыў два смяротныя прысуды. Двух суайчыннікаў, якія і раней здзяйснялі злачынствы і былі за іх пакараны і якія зараз здзейснілі калектыўнае забойства, падпальванне, рабаванне і выкраданне дзіцяці, ад імя беларускага правасуддзя асудзілі да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу.

Расстрэл. Дзіўна чуць гэтае слова ў мірны час. Адчуваеш сябе нібыта на вайне. Там, калі злавілі здрадніка і не ведаюць куды яго дзець, то звычайна ставяць тварам да сцяны і расстрэльваюць, бо адпускаць яго нельга. Зноў пачне ваяваць супраць тых, хто адпусціў, і наробіць шмат шкоды. Утрымліваць пад арыштам таксама не выпадае, бо трэба да яго ставіць ахову, значыць, здымаць байца з фронту. Трэба яго карміць, значыць, не дакладваць сваім. І трэба ўвесь час баяцца, што той уцячэ, або яго вызваляць ворагі.

Вось і загадвае нейкі там камандзір, каб ворага расстралялі. А што яму рабіць? Ён перакананы, што ваюе за справядлівыя ідэалы. Ды і на вайну ўсё спісвае, нават калі каго і расстраляў несправядліва. Маўляў, на вайне ўсе гінуць несправядліва. Куля ж дурная, не разбіраецца хто праў, а хто ўкраў. Ды яшчэ гэты камандзір і юрыдычнай адукацыі не мае, каб зразумець больш глыбінна і глабальна, выкарыстоўваючы навуковы і практычны досвед усяго чалавецтва пра тое, што такое забраць у чалавека жыццё і якія наступствы пасля гэтага ўзнікаюць.

Іншая справа мірны час. Тут існуюць усе мажлівасці, каб паставіцца да чалавечага жыцця належным чынам, не спяшаючыся з абмеркаваннем усіх за і супраць з улікам папярэдняга досведу, з ясным разуменнем, што гэта прыняце ў будучым, і ці прысутнічае ў тым справядлівасць.

Утрымліваць арыштаванага ёсць дзе, існуюць для гэтага ў дзяржаве цэлыя ўстановы і інстытуты, ды і накарміць таксама не так ужо і дорага. А за гэты час можна спакойна паглядзець чаму чалавек стаў злачынцам, што і хто піхнуў яго на гэты шлях, дзе ў яго ўчынках зверства, а дзе, як не дзіўна, і чалавечнасць.

Прыкладам, забілі злачынцы людзей, а нейкага хлопчыка пашкадавалі. Нават у іх рука не паднялася на дзіцё. А пасля папаліся і той хлопчык ужо сведчыць супраць іх. Суд выносіць прысуд. А недзе ў іншым месцы кіраўнік злачыннай банды вучыць, што нельга пакідаць сведкаў, бо, маўляў, тыя пакінулі, таму і загінулі. Пашкадавалі, маўляў, праявілі чалавечнасць, а суд іх не пашкадаваў. Не праявіў... Не стаў улічваць можа быць адзінага добрага ўчынку ў жыцці злачынцаў, значыць, і далей улічваць такіх рэчаў не будзе. Таму больш сведкаў пакідаць нельга. У злачынцаў таксама ёсць свой досвед і сваё асэнсаванне яго. І яны свае дзеянні будуюць, зыходзячы са сваіх ведаў.

А што ж сістэма правасуддзя? Усе суддзі маюць юрыдычную адукацыю. Усе яны ў студэнцкія гады праходзілі дысцыпліны, якія наглядна даказвалі, што смяротная кара не змяншае колькасці злачынстваў і ўвогуле не дае аніякага станоўчага эфекту і з'яўляецца папросту бессэнсоўным зверствам ды яшчэ прыводзіць да адмоўных рэчаў. Усе гэтыя суддзі некалі здавалі іспыты па гэтых прадметах і атрымлівалі добрыя адзнакі. Дык што ж здарылася? Няўжо яны забыліся пра тое, чаму вучыліся на юрыдычным факультэце? І як чалавек, які мае вышэйшую юрыдычную адукацыю, усё гэта вывучаў і ведае, можа ўнесці заканадаўчую прапанову пра мажлівасць існавання смяротнай кары? І як чалавек, які мае вышэйшую юрыдычную адукацыю і ведае пра негатыўныя наступствы прымянення вышэйшай меры, можа вынесці смяротнае пакаранне іншаму чалавеку?

Можа быць таму і маўчаць пра гэты суд газеты, не хваляцца тым прысудам па тэлебачанні суддзі і пракуратура. Выканаўцы гэтага рашэння добра цямяць, што грамадства больш справядлівым і добрым пасля іх прысуду не стала.

І не тлумачаць яны сваім суайчыннікам, што Беларусь адзіная ў Еўропе краіна, дзе прымяняецца смяротнае пакаранне. А злачыннасці з-за гэтай жорсткай меры не стала меней, чым у іншых еўрапейскіх краінах.

А некаму ж трэба будзе яшчэ і выканаць рашэнне суда — узяць зброю і застрэліць яшчэ двух чалавек.

Віктар САЗОНАЎ

Калі ўспамінаць, дык добра?

У народзе гавораць, што аб памерлым трэба або гаварыць добра, або маўчаць. Я з гэтым нязгодны, бо маю аж надта прыкладаў людзей, якіх цяжка людзьмі назваць, бо былі нажаўнікамі, злодзеямі ці гвалтаўнікамі. А памерлі і ўжо нельга гаварыць аб крыўдах, якія нанеслі яны людзям і да нічога і нікога на звярнуліся з просьбай аб прабачэнні. І жывыя, хто зазнаў ад злыдняў трагічнага лёсу, павінны маўчаць, каб затаіць іхнія злачынствы перад іншымі. І нават святар іх пахавае з такой малітвай і пашанай як і тых, хто даваў народу-суайчыннікам, аднавяскоўцам і гатоў даць усім сваю службу і сэрца.

У час перажыванняў трагічнага здарэння каля Смаленска я з вачэй душы не спускаў дваюраднай сястры — Жэні Андрасюк з Войнаўкі, якая нядаўна памерла спакутаваная злоснай і цяжкай хваробай. А была яна мачыхай сённяшняга выдатнага палітычнага дзеяча і пісьменніка Міхася Андрасюка і ягонай сястрычкі Мані, якой я ніколі не бачыў, але часта ад Жэні чуў, як хвалілася і цешылася Маняй і Мішам — пасынкамі, як родным сынам Віктарам.

Калі Жэня выходзіла была замуж, я ў яе быў госцем сярод мноства сваякоў. Раніцай была такая снежная завіруха, што свету не было відаць. Мы ўжо баяліся, што ніхто не прыйдзе на вяселле нават з мясцовых, а тут бачым: Жэнін і мой дваюрадны брат Павел Тарасюк з жонкай Оляй і дзіцём прыехаў аж з Жукоў з-за Кляшчэляў! Усе аж войкнулі ад здзіўлення і радасці. Пасля снедання ў царкву ехалі на санках, але былі такія гурбы, што санкі перакульваліся і мы валіліся ў снег. Я быў як варшаўскі паніч у летніх пантофліках... Буран заціхаў.

Прыехалі са шлюбу, пасядалі за сталы і ўзяліся за выпіўку. А я чуў погаласы, які то прыгожы Малады. А быў гэта Міхась Андрасюк, бацька Міхася. Я яго пазнаў быў учора, калі ён са старшым сватам па звычаю прыехаў да заўтрашняй Маладой па сарочку. Ён мне таксама адразу спадабаўся і я вельмі цешыўся, што Жэня дастане такога чалавека. За ўсё жыццё гэтае сужонства было для мяне людзьмі нейкімі святымі; там была адна дружба, узаемная пашана і любоў. Паводле расказаў людзей, а асабліва маёй аднагодкі з Грабаўца, што таксама выйшла замуж у Войнаўку — Марысі ў паненстве Беразняк, гэта была пара, якая была прыкладам працавітасці, сумленнасці і ветлівасці. У Жэні і Міхася Андрасюкоў заўсёды было многа гасцей у розныя святы. А ўжо на Успенне і я не раз у іх гасцяваў.

У гэтым месцы хачу з памяці працытаваць сваю прамову Маладым, якую я выказаў у час пасляшлюбнага абеду ў прысутнасці ўсіх гасцей: „Жэня, выходзіш замуж за прыгожага, сімпатычнага, і спадзяюся, што добрага чалавека. Але і на двое дзетак, якім будзеш абавязана быць мамай і то мамай добрай, а не такой, якая ад сіраты хавае хлеб у камору, ды яшчэ і ў пакулле, каб, увайшоўшы ў камору, не адламаў кусочка хлеба і не глытнуў яго. Памятайце абое, што дзеці нічому нічога не вінаватыя і яны нават не павінны адчуваць, што ты іх мачыха. І яшчэ абое памятайце кожны дзень аб тым, што, як кітайцы гавораць, у любві і згодзе то і гліна з'яўляецца золатам".

Калі Маладую ноччу забіралі ў Войнаўку, яна падышла да мяне і сказала, не ведаю, ці з дакорам, ці ўцехай: — Гледы, коб нэ забув прыіехаты і подывытыся на Мішыны дыеты". З прыданым мы заехалі на панадворак Міхася Андрасюка. Госці пасыпаліся дахаты, а я сабе іду і разглядаюся, якая хата, і па людзях. Пераступіў парог і бачу жанчыну з малым хлопчыкам на руках. Вітаюся, хлопчык гаворыць: „О, батюшка плішлі". Я быў у паліто і капелюшы. Мы з жанчынай, а гэта была мама Маладога, засмяяліся і яна сказала, што гэты ўнучак — Міша, сыруотка, которы будэ міэты другу маму.

Не жыве ўжо Міхась, і не жыве Жэня. Абое памерлі сваёй смерцю, але далёка заўчасна. А я ўдзячны лёсу, што мая дваюрадная сястра заслужыла на вялікую пашану ў сыноў і нявестак, і ўнукаў, і ўсіх сваякоў. Часта па тэлефоне мы размаўлялі, дык яна не магла нацешыцца дзецьмі — што яе так глядзяць і мыюць, і забіраюць да сябе, і ўсё гатовяць. Веру, бо калі памерла, дык Міхась, яе пасынак, пазваніў мне і з плачам сказаў, што мама памерла. Зрэшты, ён заўсёды пры сустрэчы са мною, калі я правакацыйна пытаўся, як сябе адчувае яго мачыха, выказваўся аб Жэні так: „Гэта мая мама, яна мяне выкармілі і выхавала". Жэня і Міхась Андрасюкі павінны быць узнагарожаны Знакам Пашаны. Ды хто простым, хаця высакародным людзям дасць узнагароды? Іхняй узнагародай будзе светлая памяць патомкаў.

Васіль ПЕТРУЧУК

Вачыма еўрапейца

Паказ шэнгенбуса

Еўрапейскае агенцтва па кіраванні аператыўным супрацоўніцтвам на вонкавых межах Еўрасаюза „Frontex" апублікавала нядаўна даныя датычныя забароны ўезду на тэрыторыю ЕС грамадзянам усходніх суседзяў Польшчы. Аказалася, што летась не ўпусцілі на тэрыторыю ЕС каля пяці тысяч беларусаў. Як тлумачыла ў Варшаве прадстаўніца агенцтва „Frontex" (гэтая арганізацыя надзяляе м.інш. дапамогу ў абучэнні памежных службаў) Ізабела Купер, не мелі яны сапраўдных шэнгенскіх віз, дакументаў пацвярджаючых мэту падарожжа альбо недастатковую колькасць грошай. Гэтая інфармацыя амаль зышлася з прэзентацыяй Падляшскай часцю Памежнай аховы г.зв. шэнгенбуса — аўтамашыны абсталяванай сучаснымі прыладамі для мабільнага кантролю дакументаў асоб, якія перасякаюць усходнюю мяжу Польшчы. ПЧ ПА мае пяць такіх аўтамашын. Дзве ездзяць у ваколіцах Аўгустова і суправаджаюць пераязджаючых польска-літоўскую мяжу, апошнія — польска-беларускую. І хоць на практыцы ездзяць яны ўжо ад пачатку года, толькі цяпер адзін шэнгенбус прадстаўлены быў журналістам на спецыяльным паказе на шашы каля Чорнай-Беластоцкай (дарога Беласток — пагранпераход у Кузніцы-Беластоцкай). Журналісты мелі нагоду на свае вочы пабачыць, як чацвёрка пагранічнікаў з шэнгенбуса, значыць, „х'юндая" і спадарожнічаючага яму чорнага „вольва", правярае шафёраў і іх машыны з беларускай рэгістрацыяй. А выглядае гэта больш-менш так. Пара функцыянераў у „вольва" намячае падазронае „на вока" аўто; у мове пагранічнікаў гэта завецца „тыпаваннем". На мігалцы „вольва" паказваецца па-польску і па-англійску загад спыненай машыне ехаць за ім да месца, у якім стаіць „х'юндай". Там пры дапамозе спецыяльнай апаратуры пацвярджаецца сапраўднасць пашпарта, рэгістрацыі, страхоўкі і г.д., а таксама грошай. Даныя ўводзяцца таксама ў базу даных, дзе правяраецца, ці выпадкам шафёр па розных прычынах не з'яўляецца асобай непажаданай у Польшчы і ў іншых краінах ЕС, не вядзецца за ім росшук, а аўтамашына не паходзіць з кантрабанды ці крадзяжу. Пераглядваецца таксама — зноў „на вока" — аўто, ці выпадкам не правозіцца ў ім кантрабанда, напр. цыгарэты.

— Гэтыя кантролі праводзяцца ў прэвентыўных мэтах, — тлумачыла журналістам на паказе маёр Анна Вуйцік, прэс-сакратар ПЧ ПА. — Цікава, што шэнгенбусы маюць больш занятку на польска-літоўскай мяжы. На гэтым адрэзку польскай мяжы прымянілі мы ад пачатку года дванаццаць прылад з шыпамі для прымусовай астаноўкі аўтамашын.

На ўскраіне Чорнай-Беластоцкай журналісты былі сведкамі некалькіх затрымання. Першым трапіў у рукі пагранічнікаў беларус з выглядам юнака. Аж шкада было глядзець на маладога чалавека, які з'ехаў на абочыну, спыняючыся пры шэнгенбусе і ўручаў дакументы функцыянерам, а яго зусюль здымалі рэпарцёры газет і тэлебачання. Што ж ён у той момант мог падумаць? У яго вачах было відаць здзіўленне перамешанае з бояззю. Пасля праверкі дакументаў аказалася, што гэта было — прымяняючы акрэсленне маёр Вуйцік — адно з прэвентыўных спыненняў; усё было о'кей. Падобна было і з наступнымі „тыпаваннямі". Да паказу шэнгенбуса дайшло пасля таго, як у свой час „Ніва" папрасіла кіраўніцтва ПЧ ПА высветліць як пагранічнікі падрыхтаваныя да ажыццяўлення дамовы аб малым памежным руху паміж Польшчай і Беларуссю (яшчэ невядома, калі гэта канчаткова адбудзецца).

Мацей ХАЛАДОЎСКІ



Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Незвычайная атмасфера Свята-Троіцкага сабора

Узнагароду Гран-пры фестывалю атрымаў Дзіцяча-маладзёжны хор Праабражэнскага сабора з Вінніцы (Украіна)

— Калі ў час выступу хору нехта ў гайнаўскім саборы перахрысціцца і пачне маліцца — гэта нармальная з'ява. Нідзе больш у Еўропе і на свеце не бачыў я такога падыходу слухачоў да выступаў хароў. Спяваючы царкоўныя творы, мы пераказваем малітву, а людзі моляцца разам з намі і гэтым спосабам ствараецца ў саборы незвычайная атмасфера, у якой прымае ўдзел мноства людзей. Няма такога другога месца ў Еўропе, дзе збіраецца такая публіка як у Гайнаўцы, і не ведаю іншага фестывалю ў Польшчы, куды прыходзіла б слухаць хары ажно столькі людзей з-па-за саміх выступаючых харыстаў, — заявіў наш зямляк, выпускнік Бельскага белліцэя Ян Палавянюк, дырыжор Акадэмічнага хору „Bel Canto" з Ольштына, які ўжо трэці раз выступіў на міжнародным фестывалі царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы, шмат разоў прымаў удзел у прэстыжных фестывалях у розных месцах Еўропы і даў больш за 200 канцэртаў у Польшчы і за яе межамі.

Пад знакам жалобы

Хаця ў час конкурсных слуханняў і гала-канцэрта прэзентавалася разнародная царкоўная музыка, сёлетні Міжнародны фестываль „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі", які з 9 па 15 мая адбываўся ў Свята-Троіцкім саборы, праходзіў у жалобнай атмасферы па прычыне загінуўшых месяц таму ў авіякатастрофе ардынарыя Войска Польскага, архіепіскапа гайнаўскага Мірана і іншых асоб, а таксама памерлага год назад пасля дарожнай аварыі гайнаўскага іерэя Тамаша Леўчука. Менавіта ў дзень адкрыцця фестывалю мітрапаліт варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава ў саслужэнні святароў з Гайнаўшчыны і іншых рэгіёнаў маліўся разам з вернікамі ў час літургіі і паніхіды за душу памерлага святара Тамаша ў сувязі з гадавінай яго смерці. Удзельнікі фестывалю мінутай цішыні ўшанавалі памяць нядаўна загінуўшых, а архіепіскапу Мірану праспявлі „Вечная памяць" .

— Сёлетняя сустрэча з царкоўнай музыкай выключная таму, што адбываецца ў цені нацыянальнай трагедыі, якая здарылася побач Смаленска. Многія з тых, што загінулі, былі прыхільнікамі нашага фестывалю і многія з іх мелі быць прысутныя на сёлетнім яго выпуску. Няхай маёвая сустрэча з царкоўнай музыкай будзе своеасаблівым гімнам, прысвечаным ахвярам авіякатастрофы, — заявіў дырэктар фестывалю, мітрафорны протаіерэй Міхаіл Негярэвіч у час яго адкрыцця. Аднак звярнуў ён увагу, што сёлетні фестываль будзе адбывацца з разнароднасцю царкоўнай музыкі і выканаўцаў, як было і ў папярэдніх гадах. Яшчэ перад фестывалем айцец Міхаіл паясніў, што царкоўная музыка не супярэчыць жалобе так, як забаўляльная музыка.

Фестываль распачаўся з інаўгурацыйнага канцэрта Хору праваслаўнага прыхода Усіх беларускіх святых з Гродна, лаўрэата мінулагодніх конкурсных слуханняў, які захапіў шматлікую публіку духоўнасцю сваёй музыкі і прыгожым спевам. Перад выступамі беларускіх харыстаў сабраныя памаліліся ў час малебна, які ўзначаліў мітрапаліт Сава.

— Царкоўны спеў фармуе і ўзбагачае людскія душы, а таксама дазваляе ўдасканальвацца, хаця ёсць у ім і мастацтва. Наш фестываль — гэта свята Гайнаўкі і ўсяго праваслаўя, а праз яго мы ўносім свой уклад у нацыянальную, еўрапейскую і сусветную культуру, — сказаў, між іншым, мітрапаліт Сава ў час фестывалю.

З кандыдатамі на прэзідэнта

У адкрыцці мерапрыемства, апрача мітрапаліта, прысутнічалі епіскап супрасльскі Грыгорый, шматлікія святары і вядомыя людзі свету палітыкі, між іншым, міністр сельскай гаспадаркі Марэк Савіцкі і кандыдат на прэзідэнта РП Анджэй Аляхоўскі. А гала-канцэрт удастоілі Браніслаў Камароўскі — маршалак Сейма і заадно выконваючы абавязкі прэзідэнта РП, старшыня СЛД Гжэгаж Напяральскі, сенатар Уладзімеж Цімашэвіч і многа іншых знатных гасцей. Гайнавяне пачалі спадзявацца, што відныя палітыкі будуць прыязджаць на фестываль у прыпушчанскі горад часцей, а Міністэрства культуры будзе фінансава ўспамагаць гайнаўскі фестываль.

— Я думаю, што тут сустрэлася малая Еўропа з разнароднасцю культур. Наша традыцыя — каб мы вучыліся разам жыць, працаваць і маліцца, — заявіў у час гала-канцэрта перад гайнаўскай публікай выконваючы абавязкі прэзідэнта РП і заадно кандыдат у прэзідэнты Браніслаў Камароўскі. Да сабраных у саборы звярталіся таксама з цёплымі словамі іншыя кандыдаты на прэзідэнцкі пост.

Малітва і мастацтва

На фестывалі, побач харыстаў з Польшчы, выступілі хары з Расіі, Беларусі, Украіны, Славакіі, Чэхіі, Балгарыі, Сербіі і Арменіі, усяго каля дваццаці пяці выканаўцаў. У час спеваў мастацтва спадарожнічала малітве. Калі былі абвешчаны вынікі працы конкурснай камісіі, аказалася, што Гран-пры фестывалю здабыў Дзіцяча-маладзёжны хор Праабражэнскага сабора з Вінніцы (Украіна). Малодшыя і старэйшыя дзеткі з гэтага хору патрапілі сваім далікатненькім спевам, вельмі добрым выкананнем царкоўных твораў і малітоўнай атмасферай захапіць як публіку, так і журы. Першае месца ў катэгорыі прафесійных выканаўцаў заняў Жаночы калектыў Манастыра св. Гегарда, што знаходзіцца побач Ерэвана (Арменія), які паказаў вельмі высокую прафесійнасць і мастацтва, а адначасна вялікую духовасць царкоўных твораў, якія выконваліся на іх радзімай і на царкоўнаславянскай мовах. Хаця харысткі гэта свецкія асобы з вышэйшай музычнай адукацыяй, па нядзелях спяваюць у манастыры св. Гегарда ў час літургій. Пераможцам з ліку акадэмічных выканаўцаў аказаўся Камерны хор Педагагічнага ўніверсітэта ў Варонежы (Расія), якога рэпертуар у галоўным абапіраецца на свецкія народныя і сучасныя творы. У Гайнаўцы запрэзентаваў ён вельмі дастойны і прыгожы царкоўны спеў з дабаўкай віртуознасці, як рабілі іншыя прадстаўнікі гэтай катэгорыі. Першыя месцы ў катэгорыях іншых хароў і дзіцяча-маладзёжных хароў не былі прызначаны, а з ліку прыхадскіх выканаўцаў першае месца атрымаў Хор Успенскага прыхода з Бельска-Падляшскага, які ўжо і раней быў таксама пераможцам на гайнаўскім фестывалі ў гэтай катэгорыі. Хор паказаў мастацтва царкоўнага спеву на вельмі высокім узроўні, а спеў харыстаў з Бельска па прафесійнасці можна раўняць з выступамі акадэмічных і прафесійных выканаўцаў.

У гэтым годзе ў конкурснай частцы фестывалю выступілі толькі два хары з Беларусі, але запрэзентаваліся яны ўдала. Цікавым выканаўцам быў Мужчынскі хор Дзяржаўнага калектыву песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, які заняў трэцяе месца ў ліку прафесіяналаў. Ужо чацвёрты раз на вялікім фестывалі царкоўнай музыкі выступілі дзяўчаты з Дзіцяча-маладзёжнага хору „Мелодыя" з Оршы, якія чарговы раз зацікавілі публіку сваім меладычным спевам і перамаглі ў катэгорыі іншых хароў.

— Нас захапляе вельмі добрая арганізацыя гайнаўскага фестывалю і духоўная атмасфера, — заявіла дырыжор з Оршы Наталля Максімцава.

Іншыя дырыжоры звярталі ўвагу на вельмі добрую акустыку ў саборы, што выдатна дапамагае спевакам.

Побач слухання царкоўнага спеву ў саборы арганізатары фестывалю запрапанавалі паслухаць царкоўную музыку ў Варшаве і розных мясцовасцях Беласточчыны, а таксама паглядзець выстаўкі „Orthphoto.net" у ніжняй саборнай царкве і „Святло з усходу" ў Гайнаўскім доме культуры. Гайнавяне і прыезджыя паехалі таксама ў Асяродак лясной адукацыі „Ягелонскае" побач Белавежы, дзе чарговы раз быў наладжаны пленэрны канцэрт свецкай народнай музыкі. У час яго выступілі выбраныя ўдзельнікі фестывалю, якія патрапілі зацікавіць публіку адметнасцю свецкага рэпертуару, характэрнага пасобным краінам.

Першае месца ў катэгорыі прафесійных выканаўцаў заняў Жаночы калектыў Манастыра св. Гегарда (Арменія), які паказаў высокую прафесійнасць і мастацтва.
У катэгорыі акадэмічных хароў трэцяе месца занялі Акадэмічны хор „Bel Canto" з Ольштына і Хор Праваслаўнага тэалагічнага аддзялення з Прэшава (Славакія), а вылучэнне сярод прафесіяналаў было прыдзеленае хору „Filokalia" з Прагі (Чэхія). Сярод прыхадскіх выканаўцаў другія раўнапраўныя месцы атрымалі Кафедральны хор Свята-Троіцкага сабора з Гайнаўкі і Маладзёжны хор Уваскрэсенскай парафіі з Беластока, а трэція месцы камісія прысвоіла Хору „Валынскія званы" з Луцка (Украіна) і Хору Прачысценскага прыхода з Бельска-Падляшскага. Вылучэнні атрымалі Мяшаны царкоўны хор „Hadži Ruyim" з Вальева (Сербія) і Епархіяльны хор „Св. Сафроній епіскап урачанскі" (Балгарыя). У катэгорыі дзіцяча-маладзёжных выканаўцаў другія месцы занялі Дзявочы хор Успенскай царквы з Краснагорска (Расія) і Хор „Schola Cantorum Misericordis Christi" з Белай-Падляшскай, а трэцяе месца заняла „Зараначка" з Ласінкі.

Чаромхаўскія юбіляры

Штогод Прэзідэнт Рэчы Паспалітай узнагароджвае медалямі шлюбныя пары з нагоды 50-годдзя супольнага сужонства. У студзені гэтага года такі юбілей адзначыла ў Чаромхаўскай гміне шаснаццаць шлюбных пар. Паколькі святкаванні выпалі на зімовы перыяд і многія сеніёры мелі б праблему даехаць у гмінны цэнтр, затым выпала нацыянальная жалоба па прычыне смаленскай катастрофы, дык мерапрыемства было адтэрмінавана на пазнейшы час. Імпрэза адбылася 29 красавіка ў мясцовым цэнтры культуры, а ўдзельнічалі ў ёй войт Міхал Врублеўскі, сакратар гміны Марыя Іванюк, працаўнікі загса Аліцыя Пытэль і Анна Калток, старшыня мясцовай арганізацыі Саюза польскіх пенсіянераў Юзэф Дубковіч, настаяцель Чаромхаўскага прыхода а. Мікалай Беламызы і дырэктар ГОКа Барбара Кузуб-Самасюк. З мастацкай часткай выступілі чаромхаўскія школьнікі пад кіраўніцтвам Барбары Смык. Медалі атрымалі наступныя пары: Васіль і Марыя Блышчукі ды Мікалай і Зінаіда Ляўчукі з вёскі Чаромха (Мікалай Ляўчук памёр), Уладзімір і Надзея ды Мікалай і Надзея Саўчукі з Кузавы, Міхал і Вера Тэрэшчукі са Ставішчаў, Уладзімір і Марыя Пагуры з Бабровукі, Уладзімір і Надзея Максімюкі з Зубач, Мікалай і Марыя Дунда, Францішак-Тадэвуш і Ірэна Грэнзяк, Мікалай і Надзея Кандрацюкі, Міхал і Раіса Ляшчынскія, Ян і Яўгенія Сідарукі, Уладзімір і Яўгенія Селяхі, Пётр і Зінаіда Васюкевічы, Мікалай і Надзея Блышукі, а таксама Анатоль і Надзея Дарошчукі з Чаромхі-Станцыі. Медалі ўручыў войт Міхал Врублеўскі.

Заклік да прымірэння

На могільніках ва ўсёй Польшчы спачываюць астанкі некалькіх соцень тысяч савецкіх салдат, загінуўшых у гады апошняй вайны. Ішлі на Берлін за радзіму, змагаліся з фашысцкімі захопнікамі, прымушаны як загадамі камандзіраў, так і пачуццём крыўды — помсціць за спаленыя вёскі, зруйнаваныя гарады. Без вайсковай падрыхтоўкі пасыланыя на згубныя акцыя гінулі тысячамі. Найбольш, амаль 32 тысячы, пакоіцца ў Браневе, 22 тысячы ў Варшаве па вуліцы Жвіркі і Вігуры, 11 тысяч у Бельску-Бялай, 8 тысяч у Вроцлаве ды ў многіх мясцінах Беласточчыны.

Пасля смаленскай трагедыі 10 красавіка 2010 года расійскі народ у асаблівы спосаб выказвае сваю салідарнасць з польскім народам. Аказванае расіянамі спачуванне, ахвота несці дапамогу, а таксама гатоўнасць да пачатку дыскусіі аб трагічных падзеях нашай супольнай гісторыі нясуць надзею на новую адкрытасць у двухбаковых адносінах.

У прызнанні гэтай салідарнасці духоўныя, інтэлектуалы і мастакі перад 65 гадавінай перамогі заклікалі палякаў падацца на могільнікі савецкіх салдат і запаліць вечны агонь на магілах расіян і прадстаўнікоў іншых нацый, якія загінулі на чужыне здалёк ад дома і блізкіх. Пад заклікам падпісаліся вядомыя асобы, такія як Ежы Антчак — рэжысёр, Ядвіга Бараньска — актрыса, Уладзімеж Цімашэвіч — сенатар, Казімеж Куц і Анджэй Вайда — рэжысёры, Адам Міхнік — журналіст ды іншыя.

Уладзімір СІДАРУК

Галерэя імя Тамары Саланевіч — адна з найлепшых візітных картачак гміны, да таго яшчэ пачынае развівацца.

Родны краявід у Саланевіч

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Галерэя імя Тамары Саланевіч у Нараўцы па вуліцы Міцкевіча 50, адкрытая 24 сакавіка 2007 года дзякуючы стараанням гміннага самаўрада ў школе памятаючай царскія часы, пульсуе жыццём. У будні дзень (12.00 — 20.00) і ў выхадны (10.00 — 18.00) можна тут паглядзець выстаўку пленэрных карцін, часовыя выставы, Рэгіянальную ізбу, у якой наладжана тутэйшая „вялікая хата". Галерэя гуртуе мастацкае асяроддзе Падляшша, прыцягвае ломжынскае і варшаўскае, а таксама мастакоў з Беларусі і Украіны. Паказваліся тут м.інш. калекцыі прац з пленэраў з 2002-2008 гадоў, „За вокнамі Дзедзінкі" — выстава жывапісу Віктара Кабаца прысвечанага Сімоне Косак, „Анёлы і д'яблы" — працы з пленэру „Чаго баімося", сарганізаванага прэсазнаўчым згуртаваннем „Стопка" з Ломжы.

На апошняй выстаўцы пасля зімовага пленэру ў Ляўкове (кончыўся ён 7 лютага 2010 г. г.) ад пятніцы 23 красавіка можна пабачыць карціны, бацік, інсталяцыю і кераміку аўтараў з Польшчы і Беларусі: Віктара Кабаца, Марыны і Валерыя Марчукоў, Андрэя Анхімовіча, Міхала Янчука, Альжбеты і Аляксандра Гжыбкаў, Алега Кабзара, Казімежа Юргелянца, Марка Хомчыка і Пятра Гагана.

У яшчэ сонечны і ветраны красавіцкі адвячорак дзверы ў галэрэю не зачыняюцца. Сярод зацікаўленых мастацтвам — войт Нараўчанскай гміны.

— Хораша памагаеце мастакам, — звяртаемся да войта Мікалая Павільча, які заўсёды паўтарае, што галерэя імя Тамары Саланевіч — адна з найлепшых візітных картачак гміны, да таго яшчэ пачынае развівацца.

— Бо трэба. Трэба памагчы, каб яны маглі заняцца і зрабіць што-небудзь.

— І тут па сабе што-небудзь харошае пакінуць.

— Гэта важна, што праца гэтых мастакоў застаецца ў гміне. Гэтыя здабыткі, якія мы экспануем у гмінных установах, думаю, што ўвекавечваюць нашу гісторыю, рэгіструюць тое, што прападае. Два гады таму мелі мы на карціне такую старэнькую хацінку з Семяноўкі — яе намаляваў адзін мастак на пленэры. Праз тыдзень-два яе ўжо не было ў рэальнасці. Запісваецца, рэгіструецца і натура, і архітэктура, і людзі. Гэта такая форма дакументацыі таго, што маем. Гміна павінна памагаць і мастакам, і галерэі. Было ўжо дзевяць пленэраў, наступны будзе летам, а можа пад восень, можа ў Семяноўцы, можа ў Ляўкове, можа ў Нараўцы. Трэба, каб і мастакі знайшлі сабе месца, дзе хацелі б заняцца сваімі справамі.

— Частку прац на пастаяннай выстаўцы ў галерэі здымаем, а вешаем новыя, — паказвае карціны ў іншых залах галерэі Віктар Кабац. — Прозвішчы знаёмыя. З Варшавы, з Украіны. На юбілейны, дзесяты пленэр будзе зроблены каталог, у форме даведніка па галерэі. Думалі выдаць цяпер, але ёсць магчымасць, што будуць грошы ад маршалка ваяводства на такі спецыяльны, прысвечаны Тамары Саланевіч. Партанажам праект мае абняць тэлебачанне, узнікне тэлевізійная дакументацыя. Тут, у нас, больш ужо як дзвесце мастацкіх работ. Частка з іх у Ляўкове — у гасцінным гатэліку, што ў самаўрадавай святліцы пры керамічным прадпрыемстве, частка ў Семяноўцы ў былой школе. Іх яшчэ нельга прадаваць. Гэты будынак і яго рамонт каштаваў паўмільёна злотых, і пяць гадоў нельга на ім зарабляць. Калі мінуць гэтыя пяць гадоў, могуць тут быць і білеты на ўваход. Збіраем такія карцінкі, пра якія можам сказаць, што яны „бліжай людзей", і тады гміна можа рабіць аўкцыён, прадаваць карціны. Ёсць цікавая канцэпцыя гэтай другой школы, што стаіць там на падворку. Ужо вядома, што 90% грошай будзе на наступную інвестыцыю, — там мае быць трыццаць начлежных памяшканняў, з самаабслуговай кухняй. Будзе і вялікая майстэрня для мастакоў, можна будзе зрабіць добрую выставу, аправіць карціны ў рамы, можна будзе там таксама праводзіць канферэнцыі. Будзем запрашаць майстроў, якія прывязуць свае працы, і на такой канферэнцыі раскажуць пра сваё майстэрства. Сустрэчы будуць арганізавацца пераважна з такімі людзьмі, што жывуць тут у гміне, але не толькі. Калі гэта будзе гатова? У маі будзе вядома дакладна колькі войт дастане грошай, і кажа, што на рэалізацыю праекта хопіць года...

Злева: Мікалай Павільч і Віктар Кабац

Вялікае зацікаўленне наведвальнікаў выставы выклікае інсталяцыя Віктара Кабаца „Варвары Космасу". Вялікі, каляровы, складзены з розных матэрыялаў экспанат правакуе да дакранання, хоць можна ім асмаліцца. Гледачы распытваюць:

— Гэта зламаная верхавіна елі?.. Тут сімвалы такія... А цікавіць мяне праматэрыял, прапачатак матэрыялу...

— Гэта рэдкі від елі, — адказвае мастак. — Я ехаў быў на ровары з пленэру з Нарвы. Ударыў пярун і зламаў елку. Была тут такая смуга ад спаленага. Пасля, калі пачаўся пленэр, я яе прыцягнуў у Ляўкова. Апаліў, абрабіў яе... Цвікі — спецыяльныя, з пляскатымі вялікімі галоўкамі. А гэтыя лікі людзей — кераміка, выпаленая ў Ляўкове. А гэта драбіна, па якой узлазяць касманаўты, ды Космас іх знішчыць. Гэтыя твары нічога не прадстаўляюць. Гэта ніякія не боскія твары, а твары людзей, якія ўжо ў Космасе пачынаюць быць варварамі. Лезуць невядома куды і невядома чаго, за велізарныя грошы, пакідаюць смецце. А на зямлі бяда. Там я гэта так назваў можа нават вельмі востра. Я на пленэрах не малюю. Гэта мой такі акцэнт. Ён не звязаны з зімой, пленэр не прымушаў да малявання ярказ зімы. Кожны малюе, што хоча. Як у пленэрах ломжынскай „Стопкі" — ёсць глыбока філасофская тэма пленэру, скажам: чаго лякаешся. Дык што, калі я баюся толькі жонкі, буду маляваць жонку?

— І яшчэ і сілы трэба, каб гэтыя цвікі паўбіваць, і нават крыху нянавісці да гэтых варвараў.

— І таму гэта ёсць такая „адскочня" ад таго, што ўвесь год робім па майстэрнях. Пленэр — гэта больш дыскусія, размовы, больш акцыя, чым маляванне. І таму на пленэры можна адысці ад мастацкіх прац, якія робяцца штодзённа. А зрабіць штось такое, чаго ў майстэрні не зробіш. Бо тут трэба паліць агнём, трэба мець якую канцэпцыю...

— Больш такіх інсталяцый, і ў „Захэнту", — заахвочваюць знатакі.

— Я такіх прац маю каля дваццаці. Восенню — бо канчаю семдзесят гэтых пяць гадоў, раблю вялікую выстаўку, у Беларускім музеі, а пасля ў „Сподках" (у Беластоку — можа ў лютым).

Пленэрныя працы і публікацыі на іх тэму былі прамоцыяй Нараўчанскай зямлі на выставах у Беластоку, Варшаве (Галэрэя Фангарувка), Гайнаўцы і Белавежы. Ад адкрыцця галерэю наведала больш за тысячу асоб — вучні, турысты з Польшчы і замежжа. На выстаўцы карціны таксама выклікаюць гарачыя дыскусіі спецыялістаў і дылетантаў. Кожны бачыць па-свойму, прабуе рассакрэціць, што меў на ўме і ў воку аўтар. Бо бывае, што родны краявід ледзь прыкмеціш сярод рыс і колераў сучаснай карціны. Вось разгарачылася дыскусія пры карціне Альжбеты Гжыбэк. Я бачу краявід — раз сонечны, яркі, аптымістычны, а ў нізоўі там буры сум. Пані Анне Стульгіс ён навочна раскрывае родную Нараўчанскую зямлю. А паліцыянт Мечыслаў Грыц узіраецца і да болю турбуецца: „Гэта я бачу, як нашу пушчу знішчаюць. Тое, што робіцца ў краіне, *то вола о помстэ до неба*. А нас тут хочуць загнаць у запаведнік. І рэжуць наш лес..."

Юбілеі ў ТБК

У суботу, 1 траўня, у Таварыстве беларускай культуры ў Літве адзначаліся два прыгожыя юбілеі сяброў ТБК: 90-годдзе Ніны Брылеўскай і 30-годдзе Юрася Юркевіча.

Гэтыя дзве лічбы: 30 і 90 — сведчаць аб пераемнасці пакаленняў, пераемнасці віленскага беларускага космасу, калі старыя беларусы-віленчукі змаглі перадаць сваю эстафету маладому пакаленню. Такім чынам можна з упэўненасцю сказаць, што пераемнасць пакаленняў адбылася, што яна не перарвалася і беларускае жыццё гэтага Вечнага Горада працягваецца.

Ніна Брылеўская была адной з самых адданых беларусак Таварыства. Нягледзячы на свае 90 год, застаецца бадзёрай, поўнай жыцця, спадзяванняў і веры ў вольную Беларусь. Нарадзілася яна 5 траўня 1920 г. у в. Лоска. Гэта недалёка ад Залесся, таго самага, дзе жыў Міхал Клеафас Агінскі. Пра сябе шаноўная юбілярка расказала наступнае:

„У часе вайны, пад нямецкай акупацыяй, я працавала настаўніцай пачатковых класаў у Лебедзеве, Смургонях, Жодзішках і Залессі. Школы былі беларускія, хадзіла ў іх шмат дзяцей, пасутнасці ўсе вясковыя дзеці. У Залессі, напрыклад, было 7 класаў. Калі прыйшлі бальшавікі, у Залессі зрабілі дзве школы: беларускую і рускую.

Пасля таго, як прыйшлі бальшавікі, я зноў працавала настаўніцай, у сваёй вёсцы, у Лоску, але нядоўга. Спачатку ў пачатковых класах выкладала расейскую мову, пасля ў старшых.

Мой бацька лічыўся ворагам народа, а я была ж членам варожай сям'і. І ў родным раёне пасля я не магла знайсці сабе працы, таму вырашыла прыехаць сюды, у Вільню. Тут уладкавалася на працу бібліятэкарам у Ерузалімцы (раён Вільні — аўт.), а затым настаўніцай у польскіх класах. Пасля я захварэла і зусім не працавала, паехала лячыцца на Каўказ. Калі выздаравела, працавала ўжо бібліятэкарам у гэтай самай школе № 14. Класы ў гэтай школе былі на польскай, рускай і літоўскай мовах. Калі хварэлі настаўнікі пачатковых класаў — я іх замяняла. Акрамя таго я яшчэ працавала сакратаром школы. І так да пенсіі.

У бацькі была свая зямля, свая гаспадарка. У 1939 г. у нас згарэла хата, і мы тады пераехалі ў Залессе. Мая маці памерла ў 1929 г., калі мне было 9 гадоў. А бацька атрымаў 10 гадоў лагераў у Карагандзе (Казахстан), пасля вярнуўся. А пасля благачынны ўзяў яго працаваць дзякам і ён працаваў яшчэ некалькі гадоў. Памёр у 1974 г. ва ўзросце 91 год і 8 месяцаў.

Ніна Брылеўская і Юрась Юркевіч

З часу, калі прыйшлі бальшавікі, мне запомніўся такі эпізод. Старшыня сельсавета засек сякерай дачку таго гаспадара, дзе ён жыў. І ніхто яго за гэта не караў. Вось такі тады час быў.

У Вільні апынулася я дзякуючы Лявону Луцкевічу. Ён мяне запрасіў, каб я памагла ў бібліятэцы. Паколькі я канчала бібліятэкарскія курсы і мела пасведчанне, мяне і ўзялі.

З Луцкевічам я пазнаёмілася ў час вайны дзякуючы майму брату. Луцкевічы ехалі ў Брэст, каб уладкавацца на працу і начавалі ў майго брата ў Лебедзеве, там і пазнаёміліся.

Была знаёмая і з кс. Вінцэнтам Гадлеўскім, з якім я спатыкалася ў Смургонях. Ён там начаваў. Мой брат пры немцах быў старшынёй Смургонскага раёна (бурмістрам). І Гадлеўскі ў нас начаваў. А пасля яшчэ Гадлеўскі прыязджаў у Жодзішкі. Там у касцёле сабралася вельмі шмат народу, і ён маліўся па-беларуску. Народ ведаў пра гэта заранёў, таму і прыйшло шмат людзей. Пасля яшчэ прыехалі з Мінска артысты і там спявалі „Мы выйдзем шчыльнымі радамі". Гэтым хорам кіраваў арганісты Трызна, але пазней забілі яго польскія партызаны.

Акрамя Гадлеўскага, памятаю, што бацька Зоі Коўш быў бацюшкам і прыязджаў у Залессе і па-беларуску казаў казанне і маліўся. Яго забілі пасля. Невядома, хто яго там расстраляў.

У нас у Лебедзеве начаваў Вацлаў Іваноўскі. І я яго нават часта аладкамі. І ён спяваў: „Кожны дзень бліны, а ў нядзелю таюны". А што гэта за таюны, я і не знаю. Размаўляў ён па-беларуску ў нас. Ехаў у Мінск на машыне і ў нас пераначаваў. Высокі такі быў, прыгожы. Машынай сам не кіраваў, быў у яго шафёр.

Як тут стварылася Таварыства беларускай культуры, я далучылася да яго працы. Увесь час цікавілася беларускім жыццём.

Мне самой вельмі прыемна, што я магу нешта зрабіць для бібліятэкі Таварыства беларускай культуры і самой арганізацыі. Я старалася і зрабіла картатэку, кожная кніжка там запісана была.

Шкода, што адышлі многія сябры Таварыства, лепшыя людзі, беларусы. 15 асобаў налічыла. Цяпер спадзявацца трэба на маладых".

Павіншаваць Ніну Брылеўскую прыйшло шмат сяброў Таварыства. Важна зазначыць, што гэтым разам былі і старэйшыя беларусы-віленчукі, тыя, хто стаяў ля вытокаў ТБК: Леакадзія Шышэя, Зінаіда Кароль і інш. На жаль, іх засталося няшмат. Але зараз, нягледзячы на свой узрост, на розныя недамаганні, яны змаглі прыйсці павіншаваць юбіляраў і перадаць свой віленскі космас маладому пакаленню, якое прысутнічала на ўрачыстасці.

Зінаіда Кароль парадавала прысутных прыгожым выкананнем беларускіх песень, якія спяваліся ў розны час.

Другі юбіляр — гэта Юрась Юркевіч, новы сябра ТБК, які ўліўся ў гэтую арганізацыю зусім нядаўна, але ўжо паспеў сябе зарэкамендаваць. Актыўна ўдзельнічае ў жыцці Таварыства, выступае на шматлікіх імпрэзах з грунтоўнымі і змястоўнымі дакладамі. Варта дадаць, што пасля смерці Юрыя Гіля ён пераняў на сябе кіраўніцтва Таварыствам беларускай мовы Віленскага краю. Хацелася б яму пажадаць плённай працы на карысць беларушчыны Віленскага краю.

І, думаю, няпоўным будзе аповед пра святкаванне двух юбілеяў, калі не дадаць, што шыкоўны стол, за якім яны адзначаліся, быў арганізаваны за кошт Юрася Юркевіча.

І напрыканцы хочацца пажадаць паважаным юбілярам доўгага і плённага служэння на карысць дарагой нам усім Бацькаўшчыны. Пакуль ёсць мы — ёсць яна. І важна яшчэ — захаваць пераемнасць пакаленняў, якая тут, у Вільні, адбылася.

Алесь АДАМКОВІЧ

За субпушчанскі запаведнік

(ав)

Праехаўся я крыху па ляўкоўска-ляшуцкіх дарогах і ў мяне паявілася даволі іканаборчая ідэя ў адрас улад Нараўчанскай гміны. Паколькі „асфальтоўка" паміж Лешукамі і Старым Ляўковам зараз нагадвае ўяўны чорна-шэры швейцарскі сыр, на ажурах якога вадзіцелі ці фурманы могуць не толькі паламаць рысоры і восі ды пагубіць колы, глушыцелі і нават пасажыраў, а пешаходы павыкручваць ногі, прапаную вышэй названым уладам звярнуцца ў розныя дароганаглядныя ўстановы з рашучым патрабаваннем закрыць гэты адрэзак для ўсялякага руху і зараз за згаданымі вёскамі паставіць непераадольныя шлагбаўмы — каб ніякі гарэза гэтага антрапагеннага шэдэўра нават выпадкова не разбурыў. Тое ж самае прапаную выканаць адносна „жвіроўкі" з Лешукоў у бок Новага Ляўкова, якая выглядае быццам вынік нейкай мэтанапраўленай дэфармацыі. Не ведаю з чаго ўзяліся такія трансфармацыі тамашняга дарожнага краявіду: ці то ад плям на Сонцы, ці то ад постчарнобыльскай радыяцыі, ці ад вулканічнага пылу, ці ад масіраванай метэорнай бамбёжкі. Варта яшчэ было б звярнуцца і ва ўстановы аховы прыродна-гістарычнай нашай спадчыны, каб тыя „дарогі" занесці ў лік прыродна-ландшафтных запаведнікаў.

А як жа ж тады было б дабірацца жыхарам Лешукоў ці Міхнаўкі ў гміныя ўстановы Нараўкі? Як жа ім паломнічаць у ляўкоўскую царкву ці нараўчанскі касцёл? Вельмі проста рашыць гэтыя пытанні: неабходна звярнуцца ў вышэйшыя свецкія і рэлігійныя ўстановы, каб памянялі падлеглыя адпаведныя гмінныя і прыхадскія граніцы. Калі Нараўка не бачыць дарог у Лешукі ці Міхнаўку, то які сэнс дурыць увогуле тамашнія гмінныя галовы гэтымі вёскамі? Мо лепш іх адчужыць пад Міхалова ці Нарву... І ў верскім ракурсе цікавае было б абнаўленне ад Старога (Ляўкова) ў Новую (Волю)...

Падумаў бы хто, што з Міхнаўкі ці Лешукоў можна было б падарожнічаць у Нараўку ці Ляўкова цераз Луку. Але і ад Лукі „асфальтоўка" таксама прапануе не меншую духовую насалоду...

Яны з „Нівай"

Называем прозвішчы ўсё новых чытачоў нашага часопіса. Пятнаццатым нумарам „Нівы" пацікавіліся, між іншым, у Нараўчанскай гміне і Гайнаўцы: Ніна Рэент, Юлія Драўноўская, Ніна і Віктар Вэршка, Міраслава Сухадола ды Яўгенія і Юрка Равінскія — усе са Старога Ляўкова; Валянціна і Аляксандр Ігнацюкі ды Марыя і Ян Янелі з Новага Ляўкова; Уладзімір і Зоя Клімюкі, Лена і Мікалай Харкевічы ды Яўгенія і Пётр Конікі з Плянты; Ніна Кічкалюк з Гарадзіска; Міхал Бароўскі са Свінароя; Люба Трусевіч з Нараўкі; Ян Сухадола з Тарнаполя ды Ніна Сэвэрын і Мікалай Янкоўскі з Гайнаўкі.

Шаснаццаты нумар „Нівы" ад 18 красавіка 2010 года з зацікаўленнем прачыталі Ніна Гаган з Гайнаўкі, Анна Стульгіс, Яўгенія Вярбіцкая і Зіна Пацэвіч з Нараўкі; Галіна Бірыцкая, Валянціна Самойлік, Лена Харкевіч ды Аляксандр і Люцына Зданоўскія з Плянты, Канстанцін Засім з Лешукоў; Міхал Болбат, Галіна і Юрка Казлоўскія, Люба Скепка ды Ніна і Лідзія Галубоўскія з Новага Ляўкова, Віталь Бачынскі з Капітаншчыны.

Лаўрэаткі IV Павятовага агляду ручных гафтаў і карунак Лена Харкевіч і Галіна Бірыцкая з Плянты, гартаючы „Ніву", знайшлі допіс „Вышыўкі і карункі" Янкі Целушэцкага пра сябе. Гэтую заметку прачыталі таксама Анна Стульгіс, Яўгенія Вярбіцкая і Зіна Пацэвіч з Нараўкі. Ніну Гаган (яна ўраджэнка Масева Нараўчанскай гміны) з Гайнаўкі зацікавіў артыкул „Ці будзе Гайнаўцы будучыня" Аляксея Мароза ды „Светла-радасны ўспамін пра пакойнага епіскапа Мірана" Ганны Кандрацюк. Допіс пра лаўрэатак Агляду ручных гафтаў яна, як жанчына, таксама не прамінула. Чытаючы родны часопіс з належнай увагай прачыталі рэдакцыйны артыкул пад загалоўкам „Ахопленыя жалобай і мы".

„Ніву" найбольш палюбілі чытачы з Новага Ляўкова, Старога Ляўкова, Плянты, Нараўкі і Гайнаўкі. Між іншым, па дзевяць экземпляраў беларускі штотыднёвік № 16 купілі ў краме ГСу ў Старым Ляўкове да 20 красавіка г.г.

Гайнаўка

Смачныя дранікі

Ад 1 красавіка г.г., ад панядзелка да пятніцы ад гадзіны 9 да 20 ды ў суботу і ў нядзелю ад 13 да 20 працуе невялікі рэстаран у Гайнаўцы па вуліцы 3 Мая. Пішу пра яго, бо ў ім падаюць смачныя дранікі. Можна тут заказаць і дранікі са смятанай ці кефірам, з грыбным соўсам або агурком ці памідорам, можна таксама і са скваркамі. Яны — смаката!

У меню рэстаранчыка — катлеты, праснакі, і яны на розны спосаб. Турысты п'юць каву або гарбату, а некаторыя піва. Маецца тут багаты выбар марожанага ды ўсялякіх ахаладжальных напояў.

У міні-рэстаране распісаны цікавы пейзаж на сцяне, прыемна тут і ўтульна. У вольную хвіліну можна пачытаць прэсу, не толькі прынесеную з сабою, заняцца разгадваннем крыжаванак. У цёплы сонечны дзень наведвальнікі абедаюць пад парасонамі перад рэстаранам.

Запрашаем у Гайнаўку на смачныя дранікі!

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Гуляйце сёння ў сапраўдных акцёраў!

На 35-м Тэатральным аглядзе для школьнікаў паказаліся два знакамітыя спектаклі. Знакамітыя, бо яны перасякалі межы школьнага тэатра ў нашай глыбінцы. Мова пра «Дзівосны гадзіннік» і «Кастынг». Паколькі першы быў ацэнены належным чынам і атрымаў Гран-пры, настолькі другі журы (у саставе Тамара Русачык, Галена Добаш і Яніна Плютовіч) спачатку хацела дысквалiфікаваць, каб урэшце назначыць ім апошняе месца — вылучэнне. Асновай двух спектакляў стала музыка, і гэта невыпадкова. Іх пастаноўшчыкі — вядомыя і прызнаныя зоркі музычнай сцэны Беласточчыны Анна Бабік і Ілона Карпюк. «Дзівосны гадзіннік» Міколы Чарняўскага быў падуманы як мюзікл з казачнымі касцюмамі і сцэнічным афармленнем. Анна Бабік не першы раз даказала, што, нягледзячы на ўзрост акцёраў, можна паставіць прафесійны, прыгожы твор.

Ілона, у сваю чаргу, «нанова» паставіла «Цацачную краму» (на словы Леаніда Дранько-Майсюка і музыку Зміцера Вайцюшкевіча і Анны Бабік). Як выпускніца Акадэміі рэжысуры фільма і тэлебачання, яна дасканала справілася і са сцэнарыем, і рэжысурай спектакля, папоўніўшы яго іранічным гумарам і сілай. У мяне склалася ўражанне, што дзяўчаты, якія іграліў пастаноўцы «Кастынг», нарадзіліся нанова. Юліта Нікалаюк, Оля Мазурук, Нінка Ваўранюк, Ліда і Ганка Пякарскія, Кася Бялькевіч, ад гадоў звязаныя з тэатральным гуртком АБ-БА, тут праявіліся як спрактыкаваныя і суперцудоўныя акцёркі. Цешыць, што іх тэатральны досвед атрымаў шанц на далейшае развіццё.

Пра апошніх выступоўцаў можна сказаць адно — усе яны (апрача пастаноўкі «Пампілё» ў выкананні АБ-БА) заслугоўвалі першага месца. Кожная група вылучалася на свой адметны і характэрны спосаб як у падборцы п'есы, так ігры акцёраў ці сцэнічнага афармлення і касцюмаў. Але не гэта аснова! Як адзначалі ўсе настаўнікі, тэатр — гэта матывіровачны дадатак у навучанні беларускай мовы. Тое, што разам могуць праяўляцца таленты дзяцей — дадатковая якасць.

А вось і афіцыйныя вынікі: Гран-пры: спектакль „Дзівосны гадзіннік" у выкананні дзетак з Польска-Беларускага прадшколля № 14 у Беластоку. І месца: пастаноўка „Мішка Мазэпчык" — ПШ № 3 у Бельску-Падляшскім і спектакль „Чортаў скарб" — Вясковы дом культуры ў Рыбалах. ІІ месца: „Пінская шляхта" — Гімназія ў Гарадку і „Як коцік матулю шукаў" — Комплекс школ у Орлі, ІІІ месца: „Мудрасць старых людзей — Дом культуры ў Гайнаўцы і „Чырвоныя шапачкі" — Беластоцкае аб'яднанне АБ-БА (ПШ № 4). Вылучэнне: „Кастынг" — Беластоцкае аб'яднанне АБ-БА (Гімназія № 7). Узнагароды для найлепшых акцёраў атрымалі, між іншым: Сара Лемеш з Орлі за ролю «Коціка», Ася Адамчык з Гарадка (роля Куторгі), Юлька Скарбіловіч (доўгая роля Мядзведзіка) і Дар'я Гліва з Бельска-Падляшскага (роля Сабакі). Такое вылучэнне атрымала і цудоўная танцорка фламенка ў спектаклі «Дзівосны гадзіннік». Апошні спектакль мусова запісаць на телекамеру і паказаць у рамках беларускай перадачы «Самі пра сябе». Тым больш, што сёлета адзначаем пятнаццаць гадоў дзейнасці беларускага прадшколля. Тэатральны рух у садку, запачаткаваны бацькамі дзетак і іх настаўніцамі, натхняе іншых. Нядаўна я глядзела спектакль «Юр'е» на гміным свяце ў Тыневічах-Вялікіх і там сустрэла фрагменты з нашага «Юр'еўскага карагоду», пастаўленага ў прадшколлі ў 1997 годзе.

Ян Сычэўскі, старшыня БГКТ, які адкрыў агляд, пажадаў, каб усе сёння пагулялі ў тэатр. Ён прывёў імпазантную статыстыку: за трыццаць пяць гадоў выступіла каля 400 калектываў і тры тысячы ўдзельнікаў. Агляд традыцыйна ўжо арганізавала БГКТ і назначыла лаўрэатам ды іх апекунам грашовыя ўзнагароды. Свята прайшло 12 мая г.г. у памяшканні Таварыства па вуліцы Варшаўскай у Беластоку.

Тэкст і фота ЗОРКА

Танец дня (прадшколле н-р 14 з Беластока)

Аня Трахімчык (Марыся) і Ася Адамская (Куторга)

Тамаш Мусько (Разгублены воўк)

Спектакль „Як коцік матулю шукаў" (Орля)

З ПАДЛЯШСКАГА СВЕТУ

Райск

Гэтым разам падляшскія шляхі прывялі нас у вёску Райск, што ў Бельскай гміне. Першы раз у пісьмовых дакументах вёска згадваецца ў 1576 годзе. Тады Райск быў даволі вялікай вёскай, якая мела 51 валоку зямлі і некалькі корчмаў. У той час Райск быў сядзібай войтаўства.

З вёскай Райск звязана вельмі цікавая легенда. Адзін з адміністратараў маёнтка Сталавач вырашыў перавезці ў двор ікону Багародзіцы, якая паказалася непадалёк Храбалоў. Каб даехаць да мэты свайго падарожжа, трэба яму было ехаць праз Райск. Калі наблізіўся ён да ўзгорка, валы, якія цягнулі воз, не хацелі ісці далей. Людзі палічылі гэта знакам ад Бога і вырашылі пабудаваць у гэтым месцы царкву і змясціць у ёй ікону.

Першая пісьмовая звестка пра ікону Божай Маці з Райска датуецца 1662 годам. У XIX стагоддзі Райск стаў вельмі важным малітоўным асяродкам ды мэтай шматлікіх паломніцтваў. У 1875 годзе ў вёсцы пабудавалі мураваную царкву.

У палове XIX стагоддзя Райск стаў цэнтрам вялікай гміны, якую састаўлялі больш за 20 мясцовасцей. Цікава таксама, што якраз праз абшар гэтай гміны праходзіла чыгуначная лінія Берасце — Граева.

У 1915 годзе жыхары Райска ўцяклі перад немцамі ў глыб Расіі. Бежанства працягвалася некалькі гадоў. Толькі пасля 1918 года людзі пачалі вяртацца на радзіму.

Але бежанства не было найстрашнейшым горам, якое спасцігла вёску. 16 чэрвеня 1942 года Райск спацыфікавалі фашысты. Расстраляных было 149 асоб, астатніх жыхароў выселілі, а вёску спалілі. Разабраная была таксама царква.

Пасля вайны жыхары Райска вярнуліся ў родную мясцовасць, каб адбудаваць яе. Але памяць пра 1942 год захавалася ў многіх пакаленнях.

Міхась СЦЕПАНЮК

Галерэя дэкламатараў „Роднае слова 2010”

Шыман Кулакоўскі

Аляксандра Тыханюк

Эмілія Сахарэвіч

Адам Лінк

Музыка з кайфам

На хвалі „Port Mone”

Хаця акардэон здаецца быць блізкім нам інструментам, то менавіта апошнія гады прынеслі яго рэнесанс. Дасканалым прыкладам таму будзе перамога акардэаніста ў вялікім тэлевізійным шоў на польскім тэлебачанні. Але ж і ў Беларусі многа прываблівых акардэаністаў, з якімі ў „Зорцы” мы таксама сустракаліся. Можа помніце размову з удзельнікамі гурту „Гурзуф”, якія асабліва ў Польшчы карыстаюцца вялікай увагай з боку альтэрнатыўных культурніцкіх асяроддзяў. Вядомай постаццю з'яўляецца таксама Аляксандр Шувалаў, майстар па акардэоне, які здаецца быць неразлучнай часткай музычных праектаў Зміцера Вайцюшкевіча. Гэта сапраўдныя выдатнікі. Да гэтага кола трэба дадаць таксама акардэаніста і іншых музыкаў гурту „Port Mone”. Нейкая дзіўная назва, якая мне якраз асацыюецца з фільмавай казкай Дыснея (Super Baloo) пра жыхароў прыморскага порта Port Mone. Музыку гэтага гурту не адзін слухач так і асацыюе з марскімі хвалямі, нават у час аднаго канцэрта за плячамі інструменталістаў можна было глядзець мультыплікаваныя карцінкі марскога жыцця. А музыкантаў у „Port Mone” толькі трох. Тры інструменты — акардэон, бас-гітара ды джэмбэ — ствараюць небывала пластычную прастору, у якой гукі мяшаюцца з адчуваннем прыроды.

Хаця ў „Port Mone” дагэтуль толькі адзін альбом, то жывуць яны вельмі багатым канцэртным жыццём. Шмат хто ведае іхнюю музыку, бо выступалі на камерных фестывалях па ўсім свеце, даволі часта таксама ездзяць з прэзентацыямі па Еўропе. Гэта дасканалы прыклад таму як слухачы, захопленыя творчасцю гурту, ствараюць сетку кантактаў, абменьваюцца ўражаннямі і ўвесь час падтрымліваюць высокую ацэнку свайму гурту.

Гурту „Port Mone” пяць гадоў. Мала гэта ці многа, цяжка сказаць. Затое я ўпэўнена, што гэта быў добры час у творчым жыцці згаданых музыкаў, якіх слухачы лічаць геніяльнымі ды адначасова вельмі сціплымі. Круг верных фанатаў паказвае, што без вялікага набытку ў якасці альбомаў можна быць у музыцы добравядомым і яшчэ лепш успрыманым.

i_basovka@o2.pl

Алімпійцы ў Варшаве

Дваццаць дзевятае красавіка. Шостая гадзіна раніцы. Амаль усе хочуць салодка спаць. Калі хтосьці ішоў бы каля бельскай „тройкі”, пабачыў бы моладзь, якая чакала турыстычнага аўтобуса. Здавалася, што гэта будзе нейкая экскурсія. Хто так думаў, не памыліўся, але і не да канца меў рацыю. Мы, лаўрэаты і фіналісты XVI Алімпіяды па беларускай мове, збіраліся ехаць у Варшаву, каб атрымаць дыпломы.

Дарога была вельмі доўгая, бо нам трэба было забраць вучняў з іншых школ, якія таксама перамаглі ў алімпіядзе. З Бельска-Падляшскага мы паехалі ў Гайнаўку, дзе каля будынка Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы чакала нас моладзь. Потым накіраваліся ў Беласток. Там дайшло яшчэ пяць асоб. Разам нас было дваццаць восем вучняў і двух настаўнікаў.

Мы думалі, што на Кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта будзе толькі ўручэнне „грамат” і нічога больш. Як аказалася, мы памыляліся... Наша сустрэча адбылася ў невялікай лекцыйнай зале. На пачатку голас узяў старшыня Галоўнага камітэта Алімпіяды па беларускай мове прафесар Аляксандр Баршчэўскі. Мы даведаліся, што вядучай постаццю наступнага этапу алімпіяды будзе Уладзімір Караткевіч. Студэнты Навуковага гуртка беларусістыкі запрэзентавалі нам сваю дзейнасць.

Надышоў час, якога ўсе чакалі — уручэнне пасведчанняў. Усе мы былі вельмі здзіўлены, калі пабачылі, што кожны атрымлівае ўзнагароды, і то не абы-якія, напр. MP3, кнігі прафесара Аляксандра Баршчэўскага, а нават ноўтбук ці лічбавую камеру.

Потым мы, задаволеныя, пайшлі на абед. Каля трэцяй гадзіны пасля поўдня наш аўтобус накіраваўся ў Пасольства Рэспублікі Беларусь. Гэта вельмі прыгожы будынак. Ён выклікаў у нас вялікае ўражанне. Кожны быў захоплены багаццем і прыгажосцю інтэр'ера залы, у якой мы звярнулі ўвагу на партрэты вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. З прыемнасцю будзем успамінаць надзвычайнага і паўнамоцнага пасла Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча прафесара Віктара Гайсёнка, які вельмі ахвотна і шчыра размаўляў з намі.

Надышоў час вяртання. Усе ўжо былі стомлены падарожжам, а перад намі было яшчэ пяць гадзін дарогі. Вяртаючыся, мы былі шчаслівыя. Усе былі згодныя, што гэты дзень быў адным з такіх, якія запамятаем да канца нашага жыцця.

Варта было прымаць удзел у Алімпіядзе беларускай мовы і варта было стаць пераможцам.

Оля ІГНАЦЮК
вучаніца I класа Беларускага ліцэя ў Бельску-Падляшскім

Польска-беларуская крыжаванка № 21

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклеенымі кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 17:

Зло, кара, жораў, гіяцынт, стыль, нага, раб, тры, ты, індык. Рута, луг, існы, мята, цыган, жыла, конь, ты, арт, рык, аўтобус.

Узнагароды, фламастэры, выйгралі **Адрыян Жукоўскі** з Дубін, **Габрыель Кузьмін, Паўліна Паплаўская** з Бельска-Падляшскага, **Крыстыян Грушэўскі, Оля Галёнка** з Арэшкава. Віншуем!



„Гранічны" мост на рацэ Чорнай

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Душа нашага часу

Беласток цяпер раскапаны на многіх вуліцах, ідзе маштабнае абнаўленне гарадскіх камунікацый. Адбываецца яно таксама і навонкі горада, разбудоўваюцца ў першую чаргу найбліжэйшыя адрэзкі магістральных дарог. Задумаў я пабачыць адну з іх, што мае абмінаць Васількаў. З боку Саколкі ўжо некалькі гадоў пакояцца маштабныя раскопы, дзе работы былі прыпынены па прычыне перакоры з боку новай у наш час грамадскай з'явы — эколагаў.

Спазніўся я на задуманы мною пэкаэсаўскі аўтобусны курс у бок Сухаволі, да прыпынку Катрынка, куды падыходзяць раскопы з боку Васількава, таму ў падарожжа падаўся беластоцкім гарадскім аўтобусам у Сахоні, ад якіх да Катрынкі ўсяго тры кіламетры. І па трасе ў Сахоні дарожныя работы ў розным разгары; у самой далі не Супраслі яны ўжо завершаны. У Сахонях адбывецца пракладка новага вулічнага палатна, новыя бардзюры чакаюць ужо новага асфальту. Шмат новых мураванак уперамежку з традыцыйнымі драўлянымі хатамі. І новыя касцёлы: у Юроўцах яшчэ ў падмуркавай стадыі, у Сахонях ужо ўзведзены сцены і ашаляваны каркас даху.

З Сахоняў кіруюся за дарожным паказальнікам у бок адлеглага толькі за два кіламетры Васількава, не маючы ўпэўненасці ці відочныя абодва канцы — ад Саколкі і ад Катрынкі — аб'язной дарогі гэтага прыгараднага горада злучаныя ўжо з сабою. Першапачатковы адрэзак дарогі ў Васількаў яшчэ ў Сахонях пракладзены па дрыгвяністым грунце, і хаця ёсць на ім нейкі слой жвіру, то дарога ж тая ўгінаецца пад нагамі, быццам пад тым жвірам былі пакладзены нейкія падушкі, быццам тудою мела прайсці казачная прынцэса з казкі Ханса Андэрсена. А зараз за Сахонямі рэчка Чорная; незвычайная гэта рэчка...

13 жніўня 1358 года літоўскі гаспадар Кейстут і мазавецкі князь Земавіт вызначылі міжсобную граніцу. Вось што пра гэтую граніцу напісаў быў ураджэнец падбельскіх Грыневіч Ігнат Даніловіч: „Kiejstut, książę litewski na Żmojdzi, Trokach i Grodnie panujący, przyjaciel i pokrewny Ziemowita księcia mazowieckiego, mając z nim spory o granice, za zgodą swych braci: Holgierda najwyższego księcia Litwinów oraz książąt Jawnuty, Korjata, Jerzego i dalszych starszych książąt Litwy, wyznaczył kommissją graniczną z książąt i bojarów, to jest Patryki, Wojszwiłła, Ayksy, Olizara i Waska Kierdejowiczów, a Ziemowit mazowiecki upoważnił Wykoszona czerskiego, Mroczka raciążskiego, Niemirę sochaczewskiego, Gotarda kamieńskiego kasztelanów, tudzież Stefana sędziego sochaczewskiego. Ci zjechawszy się do Grodna, między Litwą a Mazowszem ustanowili następne granice. (...) Naprzód i głównie począwszy od miejsca zwanego w pospolitym języku Kamienny Brod (недзе ад прускай граніцы) idzie się prosto ku Rajgrodowi, a od Rajgrodu postępując po rzece Meta (Нэта?), od Mety wprost po rzece Bebrza, aż do Targowiska (?), od Targowiska zaś obraca się prostą linją do ujścia wielkiej strugi (Бжазоўкі); dalej udawszy się po tej rzece aż ku wierzchołkowi rzeczułki Małej Suchołdy (Чорнай), od wierzchołka Małej Suchołdy w dół się zwróciwszy postępuje się po biegu rzeki wprost aż do rzeki czyli rzeczułki Szprzaśla (Супраслі)". А Супрасль прымае Чорную зараз за Васількавам; далей граніца гэтая кіравалася па Супраслі на захад да Нарвы.

Пазней згаданая граніца па Бжазоўцы і Чорнай засталася граніцай Падляшскага ваяводства з Трокскім, а яшчэ пазней Кароны з Княствам, але ад Васількава кіравалася яна на поўдзень, размяжоўваючы Беласток з Васількавам; Беласток аставаўся ў Бельскім павеце Падляшскага ваяводства, а Васількаў у Гарадзенскім павеце Трокскага ваяводства. Дзеля цікавасці працытую Зыгмунта Глогера пра далейшы ход гэтай граніцы: „Od rzeki Supraśli pod Wasilkowem biegła granica sucha na południe aż do wsi Gródka (?) nad Narwią, przy ujściu Narewki, potem brzegiem zachodnim puszczy Białowieskiej, która już do województwa Brzesko-litewskiego należała. Sucha ta granica, okrążywszy podlaskie Kleszczele, dochodziła rzeki Nurca o milę powyżej Bociek i biegła znowu na południe w górę Nurca (хіба Нурчыка), a dalej suchym lądem aż do Niemirowa nad Bug i od Buga na południe aż pod Parczów, tak że Janów, Biała, Łomazy i Wisznice leżały w województwie Brzesko-litewskim, a Międzyrzec, Rossosz i Horodyszcze na Podlasiu".

Рэчка Чорная займела сваю назву, мабыць, ад чорнага балота, што залягло ў яе пойме. Зараз за Сахонямі высакаваты мост праз яе, збудаваны паводле навейшай тэхналогіі; ён яшчэ свежанькі, яшчэ жоўты пясочак па абочынах пралягаючай па ім жвіроўкі не страціў свайго залацістага колеру. З таго моста відаць пачаткі землерыйных работ пад будучую аб'язную дарогу, адлеглую каля кіламетра чорную паласу выбранага з равоў балота; насыпу яшчэ не відаць, не відаць і моста, па якім яна пойдзе.

Зараз за мостам дужманы статак авечак і коз, на дарозе мужчына з веласіпедам; гэта гаспадар выпушчанага на свежую траўку статка. Пытаю яго, ці ведае, у якой беластоцкай краме можна купіць бараніну, а ён мне адказвае, што, мабыць, у ніводнай. Найбліжэйшы пункт скупкі авечак знаходзіцца ў Карыціне, адкуль іх адпраўляюць на захад Еўропы — там людзі ўжо свядомыя, якія харчы здаравейшыя. Пытаю яго яшчэ пра толькі што пройдзены мною мост; ён інфармуе мяне, што пабудаваны ён у канцы мінулага года. Але які гэта мост? Той, што быў тут раней, меў душу!!!

Даходжу да чыгуначнага пераезду, за якім пачынаюцца вялікія жоўтыя пясочныя тэрыконы і катлаваны, дзе пачынаецца гул землерыйных машын, узнавіўшых пракладку новай маштабнай дарогі край Васількава, спыненай калісь эколагамі. Пойдзе яна, шырокая, пад новым чыгуначным віядукам; чыгуначная варшаўска-пецярбургская лінія была на гэтым адрэзку пабудавана ў 1857 годзе...

У 1784 годзе васількаўскі плябан Мацей Яблонскі так характарызаваў адну з мясцовых дарог: „Droga z Wasilkowa do Sokołki piaszczysta, kamienista, górzysta, korzenista i nie bez brodów. Jazdy letnią drogą blisko ośmiu godzin, zimową blisko pięciu". Гэта была дарога з адметным характарам, з душою. А цяпер пакладуць роўны як стол асфальт, без пяску, без камянёў, без каранёў. Зусім безрэфлексіўную дарогу — без душы... Выходзіць яна на сакольскую шашу побач санктуарыя Святая Вада. Ужо ад чыгункі відаць велізарныя сучасныя пракатныя крыжы ўзведзеныя — найбольшыя з іх ужо ў XXI стагоддзі — побач гэтага санктуарыя; здаецца мне, што ў іх такая ж мегаламанская душа, як і ў кладзенай побач аўтамагістралі...

Пра вытокі санктуарыя ў Святой Вадзе ёсць дзве легенды і абедзве яны блізкія гістарычным фактам...

Калісь наваколле сённяшняга Васількава было ўласнасцю нейкага Васіля, які меў двух сыноў. Малодшы з іх страціў зрок і ягоны старэйшы брат выгнаў яго з хаты. Бадзяючыся па бездарожжах пачаў маліцца за Божай дапамогай. Калі заснуў, паказалася яму Багародзіца, загадваючы разгарнуць зямлю пад ім. Калі ён гэта зрабіў, адтуль заструілася вада, якою ён прамыў вочы і яму вярнуўся зрок. У падзяцы за ратунак ён пабудаваў у тым месцы студню, а над ёй будан, у якім павесіў іконну Багародзіцы. Ксёндз Войцех Міхневіч прымяркоўвае гэтую падзею да гістарычных постацей XIII стагоддзя, менавіта да сыноў Рамана Мсціславіча, галіцкіх князёў Данілы (1201-1264) і Васілька (1205-1271, ад якога і назва мясцовага горада); старэйшы Даніла меў клопаты са зрокам і гэта яму мела дапамагчы мясцовая гаючая вада...

Другая легенда таксама заключае элемент сямейнай жорсткасці. Менавіта, ужо ў XVIII стагоддзі састарэлы жыхар Супрасля Васіль Папернік стаў траціць зрок. Ягоны сын, падбухтораны жонкай, вывез бацьку ў лес і там яго пакінуў. У нядолі дапамагла яму таксама Багародзіца, якая падказала пра крынічку, вада з якой загаіла ягоныя вочы. Аздаравелы бацька вярнуўся дадому, а раскаяны сын пабудаваў над гаючай крыніцай драўляную каплічку; яе пасвянцілі ў дзесятую пятніцу пасля Вялікадня 1719 года. Магчыма, што згаданы Васіль, як паказвае ягонае прозвішча, працаваў у супрасльскай паперні пры тамашняй уніяцкай друкарні...

Каплічка тая займела далейшую бурную гісторыю, але ў мясцовых умовах тыповую. Яшчэ ў 1784 годзе згаданы ўжо плябан Яблонскі пісаў пра яе: „Kaplica do (...) cerkwi wasilkowskiej należąca, Święta Woda zwana, pod północą między puszczą pół mili wielkie". (Тагачасная вялікая міля мела больш за восем цяперашніх кіламетраў.) Неўзабаве, у 1785 годзе, пацярпела яна ад менавіта буры так, што трэба было яе адбудоўваць. Пратрывала яна да 1876 года, калі побач была ўзведзена мураваная, праваслаўная ўжо, капліца, якая з 1921 года стала служыць каталікам. А каталікі атрымалі яе таму, што была яна пабудавана за іх сродкі ў рамках кантрыбуцыі за ўдзел у Студзеньскім паўстанні. У 1940 годзе саветы разбурылі яе да сцен. У 1950 годзе была яна адбудавана. У 1951 годзе пробашчам васількаўскай парафіі становіцца ксёндз Вацлаў Рабчынскі, які вакол капліцы будуе маштабную паломніцкую інфраструктуру...

Царква ў Васількаве

Па дарозе з санктуарыя ў цэнтр Васількава стаяць крыжы-трайняты; на тым месцы 11 лістапада 1991 года загінула трое пілігрымаў. Бо пілігрымка гэта ахвяра, часам літаральная. Не так даўно ж пад Яжэвам загінулі беластоцкія пілігрымы ў Чанстахову, на схілах французскіх Альпаў загінулі польскія пілігрымы з Лурд, ды і апошні трагічны выпадак на смаленскім аэрадроме таксама здарыўся ў часе свайго роду пілігрымкі...

Па абодвух баках шашы з Васількава ў Саколку могілкі: з аднаго праваслаўныя, з другога каталіцкія; асаблівай увагі варты апошнія. Менавіта згаданы ўжо ксёндз Рабчынскі пабудаваў там у 1950-х гадах своеасаблівы біблейскі парк з уласнай работы скульптурамі, падпісанымі цытатамі з Бібліі; унікальная гэта некраполія... Ягоная маці таксама ўнесла мастацкі ўклад у згаданы раней санктуарый — яна намалявала галоўны там цяпер абраз Маці Божай.

Пра Васількаў польскі гісторык Эдвард Малішэўскі пісаў у пачатку мінулага стагоддзя: „W okolicach W[asilkowa] Leszek Czarny w r. 1282 pobił księcia litewskiego Trojdena wraz z Jadźwingami. W bitwie tej Jadźwingowie po raz ostatni wystąpili na widowni dziejowej". Пра яцвягаў пісаў і Даніловіч: „Jadźwingowie, naród siedzący w dzisiejszym Podlasiu (...) jest niezawodnie Azyatyckim przybyszem (Henning). Jest on podobno szczepem tych Sarmatów, których greccy i łacińscy pisarze Jazygami nazwali". Хіба ад гэтага названня пайшлі і *языцы* — язычнікі. Вось дзе ім, каля Святой Вады, адбыўся такі Страшны суд...

Люстрацыйны абманшчык? (6)

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

— Пасля кожнай інфармацыі, што гэты працэс працягваецца, на мой адрас ды адрас праваслаўнай і беларускай грамады ляцяць абразлівыя выказванні, а нават каральныя пагрозы, — сказаў перад Акруговым судом у Беластоку дэпутат Яўген Чыквін у час чарговага разбору з абвінавачання беластоцкага аддзела Інстытута нацыянальнай памяці, які закідае яму люстрацыйны абман.

Прыгадаем, што паводле пракурора ІНП Агнешкі Русіловіч, якая спасылаецца на архівы Службы бяспекі, вынікае, што Яўген Чыквін меў быць сакрэтным супрацоўнікам (сексотам) тых службаў да 1989 г. Мелі яму даць псеўданімы Ізыдар, пасля Вільгельм. Дэпутат гэтаму пярэчыць. Сцвярджае, што неаднойчы падаваў люстрацыйныя заявы і быў ачышчаны з абвінавачанняў заступнікам публічнага інтарэсу пасля таго, як яго прозвішча апынулася на г.зв. спіску Мацярэвіча, значыць, пераліку агентаў спецслужбаў ПНР. Тое падазраванае супрацоўніцтва мела датычыць перш за ўсё перыяду, калі Чыквін кіраваў беластоцкім аддзелам Хрысціянскага грамадскага згуртавання (ХГЗ).

У гэты раз разбор працягваўся асабліва коратка; крыху больш за паўгадзіны. Старшыня судзейскага складу Беата Аліферук адчытала паказанні функцыянера СБ Антоні Й. (пра прычыне яго хваробы былі праведзены ў яго месцы жыхарства). У мінулым правяраў ён, ці Яўген Чыквін падыдзе на сексота СБ.

Яўген Чыквін і яго абаронца Кшыштаф Чашэйка-Сахацкі перад разборам пазнаёміліся з пракурорскімі заявамі

— Яўген Чыквін меў доступ да тайнай канцылярыі Польскай дзяржаўнай чыгункі, — заявіў Антоні Й. пасля паказання яму дакументаў, што мела таксама цікавіць СБ з пункту гледжання магчымага схілення да супрацоўніцтва.

Дадаў:

— Не прыгадваю, чаму не дайшло да рэгістрацыі Чыквіна як сакрэтнага супрацоўніка.

Прызнаўся, што паказаная яму папка дэпутата з ІНП гэта „нейкая зборная папка", а не папка сексота; звычайна былі дзве асобныя: ходу працы і персанальная. З яго тлумачэнняў вынікала, што Яўген Чыквін не падпісаў дэкларацыі супрацоўніцтва, а таксама не быў і г.зв. асабовай крыніцай інфармацыі.

Пракурор Русіловіч падала тры заявы. Цікавілі яе разыходжанні адносна нумарацыі і дат у дакументацыі актаў абвінавачанага і выказванне эксперта на тэму ўліку аперацыйнай працы ў СБ.

— Орган [пракурор ІНП — М. Х.], які падрыхтоўвае заяву, хоча, каб такія сумненні суд браў на сябе. Лічу гэта неадпаведным, — пераконваў Кшыштаф Чашэйка-Сахацкі, абаронца Яўгена Чыквіна. — Гэтыя заявы накіраваны дзеля працягвання працэсу, хоць парламенцкія выбары будуць толькі праз год.

Сам абвінавачаны ў гэтым кантэксце пералічыў, што кожны люстрацыйны працэс каштуе падаткаплацельшчыкам каля 6 мільёнаў злотых:

— Гэта мэтанакіраваныя дзеянні на шкоду маю і ўсяго майго асяроддзя.

Суд аддаліў заяву на прызначэнне эксперта:

— Такі доказ дапускаецца, калі неабходны спецыяльныя інфармацыі. У гэтым выпадку суд чэрпае іх з допытаў сведкаў.

Калі гаворка аб заявах датычных разыходжанняў у нумарацыі і датах дакументаў, суд пачакае яшчэ высвятленняў... архіўнага аддзела беластоцкага ІНП (пракурор Русіловіч з'яўляецца там выконваючай абавязкі кіраўніка люстрацыйнага аддзялення), які да дня апошняга разбору не паспеў іх даслаць.

Чарговы разбор вызначаны на 24 мая. Не выключана, што ў той час абодва бакі агучаць свае апошнія прамовы. Калі б так сталася, можа, гэты працэс завяршыўся б яшчэ да канікул.

АДГАЛОСКА

Шаноўная рэдакцыя „Нівы"!

У „Ніве" № 19 за 2010 год мы прачыталі артыкул пад загалоўкам „Новыя чатыры гады Аб'яднання АБ-БА". Аўтарка піша: *Усе ведаюць пра хуткі заняпад вучобы, але нагул баяцца гаварыць*. Пішам да вас, бо мы якраз не баімся.

Хочам паясніць адно: выбар заняткаў у ліцэі, гэта выбар саміх вучняў, а не іх бацькоў ці настаўнікаў з гімназіі. Яны не могуць нас прымусіць, на якія ўрокі мы павінны хадзіць. Мы ходзім на ўрокі беларускай мовы і гэта наш выбар! Гэта не проста і адказна. Заняткі ў нас па суботах, матэрыялу шмат. Не падабаецца нам таксама, што за невялікую колькасць навучэнцаў беларускай мовы аўтарка вінавацiць настаўніц з ліцэя і гімназіі. Апошнім часам мы падрыхтавалі адкрыты дзень, аднак гімназісты не пацікавіліся прапановай. Беларуская мова ў беластоцкім ліцэі толькі чатыры гады. У гэтым годзе адбыўся ўжо XVI выпуск алімпіяды. Як відаць, конкурс не быў прыдуманы выключна для Беластока. Першыя навучэнцы нават не думалі, што будуць прымаць у ім удзел. Аднак ім пашанцавала, большасць з нас стала фіналістамі і нават лаўрэатамі. Усе мы разумеем, што ўдзел у алімпіядзе мае многа плюсаў, між іншым індэксы, аднак гэтага мы не ставім на першым месцы. У ліцэі мы маем магчымасць грунтоўна пашырыць свае веды па беларускай культуры і мове.

Тут упершыню мы даведаліся хто гэта Уладзіслаў Сыракомля і хто аўтар „Спеваў пра даўніх ліцьвінаў". Веды, якія мы набылі на ўроках беларускай мовы, выкарыстоўваем на іншых прадметах. Уразіў нас сказ аб прапагандзе, бо мы аб ніякай прапагандзе не чулі...

Прытым мы хацелі б адзначыць, што ведаем пра сустрэчы і заняткі, якія арганізуе аб'яднанне АБ-БА. Відаць, яны не падыходзяць нам як людзям у ліцэйскім узросце. Трэба зразумець, што ліцэісты маюць права і патрэбу на свой выбар. Мы інстынктыўна адкідаем свет бацькоў, нават калі ён для нас выгадны і найлепшы. Такая праўда жыцця.

На канец мы хочам сказаць, што кожны, хто свядома рашыў вывучаць беларускую мову, задаволены. Наша настаўніца, паводле нас, вельмі добрая, мы можам шмат навучыцца, пагутарыць пра розныя справы, пасмяяцца. Кожны кій мае два канцы. Шкада, што Ілона Карпюк, пішучы пра ліцэй, не пацікавілася нашымі думкамі і эмоцыямі.

Навучэнцы беларускай мовы ў III Аўльнаадукацыйным ліцэі імя К. К. Бачынскага ў Беластоку: Ганна Пякарская, Наталля Кандрацюк-Свярубская, Аляксандра Каліна, Матфей Севастыянік, Аляксандр Ваўранюк, Аляксандр Мазурук, Аляксандра Максімюк.

Шаноўныя ліцэісты!

Вельмі цешыць нас, што чытаеце „Ніву" ды становіцеся ў абарону сваіх спраў. Усе разумеем як важная для беларусаў з'яўляецца адукацыя на беларускай мове ў Беластоку. Вы якраз тая моладзь, якая з бацькоўскай хаты вынесла патрэбу яе вывучэння і маеце нагоду здабываць веды дзякуючы сапраўды добра падрыхтаванай настаўніцы. Становіцеся дарослымі людзьмі, таму вы павінны таксама зразумець, што пасля вас прыйдуць чарговыя пакаленні, якія таксама не павінны забываць беларускай мовы і культуры. Менавіта аб'яднанне АБ-БА створана на тое, каб пастаянна гуртаваць людзей, якія турбуюцца за нашы дзеці і іх адукацыю. Калі пішаце, што вашым адкрытым днём не пацікавіліся нашы гімназісты, тады я і ўсе зацікаўленыя маем права непакоіцца за далейшы лёс навучання беларускай мовы ў Беластоку, асабліва тады, калі вы ўжо яе закончыце.

Ілона КАРПЮК

„Прымакі" ў Доме Коласа

Дом-музей Якуба Коласа, дзе і сёння адчуваецца прысутнасць колішняга гаспадара, заўсёды прыцягваў творцаў. З часоў беларускага класіка ў доме нярэдкімі гасцямі былі літаратары і дзеячы культуры з-за Буга. Вось і 5 мая гэтага года ў мемарыяльнай гасцёўні народнага паэта адбылася творчая сустрэча з артыстамі беларускага фальклорнага ансамбля „Прымакі" з Гарадка. Калектыў з Беласточчыны прыехаў у Мінск павіншаваць з 20-гадовым юбілеем тэатр „Зьніч" і непасрэдна яго мастацкага кіраўніка і дырэктара Галіну Дзягілеву.

У імпрэзе прынялі ўдзел мастацкі кіраўнік ансамбля „Прымакі" Юрась Астапчук, вакалістка Багуслава Карчэўская, Галіна Дзягілева, якая з'яўляецца даўнім сябрам музея Якуба Коласа, а таксама сын Якуба Коласа Міхась Міцкевіч. З прывітальным словам да шаноўных гасцей і слухачоў (навучэнцы філіяла Каледжа сельскай гаспадаркі ў Мар'інай Горцы, а таксама супрацоўнікі музеяў г. Мінска) выступіла дырэктар музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская. Урывак з паэмы Якуба Коласа „Новая зямля", які на самым пачатку агучыў Міхась Міцкевіч, выдатны чытальнік і дэкламатар, настроіў удзельнікаў і аўдыторыю на паэтычны лад. Галіна Дзягілева прадставіла сваіх сяброў, распавяла пра адметнасць калектыву з Беласточчыны, у рэпертуары якога беларускія, украінскія і польскія народныя песні. Надзвычай прыемна было чуць з вуснаў гарадоцкіх гасцей прыгожую сакавітую беларускую мову, эмацыянальныя словы пра неабходнасць шанавання родных каранёў і культуры. Сапраўдным падарункам для прысутных стала беларуская народная песня „Ой, сівы конь бяжыць" у выкананні гарадоцкіх гасцей, якія на развітанне паабяцалі і надалей не абмінаць гасцінную Коласаву сядзібу.

Старшы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа
Ірына КАЗЛОВІЧ

ВЕРА РАМУК (6.9.1931–5.5.2010)

Беларуская супольнасць у ЗША і ва ўсім свеце панесла вялікую страту: 5 траўня ў Чыкага пасля нядоўгай хваробы памерла Вера Рамук, вельмі актыўная дзяячка нашага эміграцкага асяроддзя ў другой палове мінулага і ў пачатку цяперашняга стагоддзяў.

Яна нарадзілася 6 верасня 1931 года у Сабарах (тады гэта была Польшча, цяпер — Докшыцкі раён на Віцебшчыне, блізка ад Глыбокага) ва ўніяцкай сям'і Стэфана Жызнеўскага і Еўдакіі Гапанёнак. Пасля ўз'яднання Беларусі Жызнеўскія былі сярод тых, каго „планавалі" выслаць у Сібір. Потым была нямецкая акупацыя, і ў 1944 годзе сям'я пераехала ў Нямеччыну. Адтуль у 1949 годзе яны перабраліся ў Злучаныя Штаты Амерыкі.

Спачатку жылі ў гарадку Пеорыя ў штаце Ілінойс. Там Вера закончыла факультэт вольных навук ва Універсітэце Брэдлі (1954). Прымала актыўны ўдзел у студэнцкім жыцці, у розных аўдыторыях распачынала свае роспаведы пра Беларусь і яе народ, ужо там арганізавала жаночы ансамбль беларускага танца. Пазнаёмілася з доктарам Вітаўтам Рамуком, таксама вельмі актыўным эмігрантам з радзімы. У 1958 годзе яны пажаніліся.

У 1963 годзе Вера і Вітаўт Рамукі пераехалі на сталае месца жыцця ў Чыкага. Неўзабаве яны разгарнулі ў гэтым горадзе вельмі актыўную грамадскую дзейнасць, мэтай якой было аб'яднанне тых, хто прыехаў з Беларусі. Многае ўдалося зрабіць: Беларускі каардынацыйны камітэт, які ўзначальвалі Вітаўт і Вера Рамукі, злучаў у цікавых агульных грамадска-культурных мерапрыемствах беларусаў, што гуртаваліся вакол уніяцкай парафіі Хрыста Збаўцы і праваслаўнай царквы св. Юр'я. Дзякуючы спадарыні Веры да многіх падзей далучаліся і тыя, хто прыязджалі ў эміграцыю з Беларусі ў дзевяностыя гады і пазней. Вера Рамук сваёй адкрытай шчырасцю і няспыннай дзейнасцю аб'ядноўвала многіх, хто не забыўся пра радзіму, незалежна ад паходжання і веравызнання, — і гэта, як уяўляецца, мае і сёння асаблівае значэнне.

Вера Рамук была ініцыятарам многіх сустрэч з палітыкамі і грамадскімі дзеячамі ЗША, на якіх звярталася ўвага на палітычнае становішча ў Беларусі, на стаўленне ўлад да нацыянальнай мовы і культурнай спадчыны, на спрадвечныя спадзяванні беларусаў быць вольнымі і незалежнымі. Яна сустракалася з прэзідэнтам Рэйганам, перапісвалася з прэзідэнтамі Клінтанам і Бушам і многімі іншымі палітычнымі дзеячамі ў Вашынгтоне і ў штаце Ілінойс. У 1974 годзе Вера Рамук з вялікай групай тых, хто з Беларусі, сустракала і вітала слаўтага беларускага мастака Марка Шагала на адкрыцці ў цэнтры Чыгага яго мазаікі „Часіны году" — найвыдатнейшага ў свеце шэдэўра выяўленчага мастацтва. Яна арганізоўвала экспазіцыі твораў мастакоў і канцэрты музыкантаў, што прыехалі сюды з Беларусі, рыхтавала выданне розных кніжак з беларускай побытавай тэматыкай, ініцыявала рэгулярную выставу беларускіх новагодніх ялінак у мэрыі Чыкага і ў офісе графства Кук, прымала актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і абавязковым штогадовым святкаванні ў сакавіку нашага Дня Волі. Многія, хто прыязджаў з Беларусі ў Чыкага, лічылі за гонар пабываць у доме Рамукоў, пагутарыць з імі... Вера Рамук пісала цудоўныя вершы, — гэты кірунак яе дзейнасьці патрабуе асобнай гаворкі.

Сталася так, што 9 сакавіка памёр Вітаўт Рамук, а амаль праз два месяцы пайшла з жыцця і спадарыня Вера. Выказваем шчырае спачуванне іх дачцэ Ірэне, сыну Джону, унукам і ўсім родным і блізкім гэтых цудоўных і значных асоб. Памяць аб Веры і Вітаўце Рамуках будзе жыць доўга ў сэрцах тых, хто іх ведаў, у сэрцах усіх, каму не абыякавая ідэя захавання беларускай культурнай і ідэйнай спадчыны, беларускай самасвядомасці.

фэстываль удзел работы

Найгалоўнейшае ў рэкламе гэта тое, каб яе заўважалі. Дзеля таго ўсе рэкламныя банэры, плакаты і ўлёткі робяцца ў яскравых колерах, якія адразу кідаюцца ў вочы. Але кінуцца ў вочы гэта яшчэ толькі зрабіць палову справы. Да яскравага колеру мусіць быць дададзены такі слоган, выраз якога хоць не надоўга, але затрымаецца ў галаве звычайнага спажыўца. Каб слоган быў адметны, распрацоўшчыкі рэкламы твораць хто на што здольны. У Беларусі, у выніку сваёй творчай працы, яны слушна прыйшлі да высновы, што адметнасць мае слоган напісаны па-беларуску. Пачуцці горкага суму і прыемнага задавальнення перамешваюцца ў душы нацыянальна свядомага чалавека.

Але пачуцці пачуццямі, а гандаль трэба неяк рухаць, прычым скарыстоўваючы беларускую мову. І вось колькасць беларускамоўных рэкламных з'яў узрасла настолькі, што нават з'явіўся сэнс правесці адмысловы першы фестываль беларускамоўнай рэкламы і прамоцыі „Аднак!", уся інфармацыя пра які месціцца на сайце **http://adnak.by.**

Сайт зроблены вельмі ўдала, зважаючы на рэкламную тэматыку. На ім пераважаюць бела-чырвона-шэрыя колеры. Выйсці да рубрык знаходзяцца наверсе выяўлення. У іх дэтальна распавядаецца пра ўсе акалічнасці, звязаныя з правядзеннем фестывалю, умовамі ўдзелу. Праўда, некаторыя выйсці закрывае сабой вялікі клічнік і прайсці на іх немагчыма. У выніку губляешся ў дагадках — можа гэта так спецыяльна было зроблена і пазней распрацоўшчыкі сайта адсунуць куды падалей гэты клічнік, адкрыўшы прыхаваныя рубрыкі.

Сам фестываль прэзентуецца на галоўнай старонцы. „Конкурсны этап Першага фестывалю беларускамоўнай рэкламы і прамоцыі Adnak! распачалі 13 траўня ў Мінску агульнанацыянальная культурніцкая кампанія «Будзьма беларусамі!» у партнёрстве са спецыялізаваным інтэрнэт-рэсурсам Marketing.by", — распавядаюць пачынальнікі вельмі незвычайнага для беларусаў і цэлага свету мерапрыемства. Яны глыбока ўпэўненыя, што „колькасць людзей, якія хочуць успрымаць самую розную інфармацыю, у тым ліку і праз рэкламу, на беларускай мове, дынамічна расце".

Як сцвярджала на прэсавай канферэнцыі каардынатар кампаніі «Будзьма беларусамі!» Алена Макоўская, па выніках спецыяльнага даследавання, праведзенага з удзелам «Будзьма беларусамі!», каля 40% беларусаў хацелі б бачыць рэкламу на „матчынай мове". Хоць у агульным аб'ёме рэкламы ў Беларусі на яе прыходзіцца ледзьве 1%.

Па меркаванню арганізатараў фестывалю, „да мая 2010 года амаль ніхто ўсур'ёз не займаўся сістэматызацыяй і аналізам беларускамоўнай рэкламы, нягледзячы на тое, што ў апошні час павялічваецца цікавасць рэкламістаў да ўжывання ў сваіх працах беларускай мовы".

Прымаць удзел у фестывалі, згодна інфармацыі, пададзенай на аднайменнай старонцы, можа практычна кожны і бясплатна. Няма ані ўзроставых, ані тэрытарыяльных абмежаванняў.

Праграмай фестывалю прадугледжана правядзенне некалькіх конкурсаў па розных накірунках, распавядаецца ў рубрыцы „Намінацыі". Ну, а лепшыя з лепшых напрыканцы чэрвеня будуць узнагароджаны спецыяльнымі прызамі і дыпломамі фестывалю, абяцаюць яго арганізатары ў рубрыцы „Узнагароды".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Тупанне на месцы

Прызнаюся, што пачаў я пісаць гэты матэрыял яшчэ да пачатку нядзельнага матча на чэмпіянаце свету беларускай хакейнай дружыны з гаспадарамі спаборніцтваў — немцамі. І пачаць захацелася з агульнай высновы — айчынны хакей за апошнія 15 гадоў практычна не зрушыўся ў развіцці і топчацца на месцы. Беларуская хакейная зборная — гэта даволі трывалая сістэма ў сэнсе выбару кадраў. Безумоўна гэта не датычыць трэнерскага штаба, які перыядычна, часам з гучнымі скандаламі, мяняецца. А вось што датычыць гульцоў, то выбар кваліфікаваных выканаўцаў як быў бедны, так такім і застаецца. І толку, што наша родная экстраліга ўвесь час штучна пашыраецца колькасна. Экстэнсіўны шлях развіцця дае мала. З году ў год галоўная каманда краіны збіраецца практычна ў адным складзе. Канешне, з аднаго боку гэта добра — калектыў прытым мусіць быць зладжаны. Дарэчы, амаль ніхто з беларускіх галоўных трэнераў не атрымліваў сур'ёзных прэтэнзій у пытаннях камплектавання. Таму што ніхто сабе не вораг і сапраўды імкнецца збіраць усіх мацнейшых.

І на гэты раз Эдуард Занкавец запрасіў на першынство ў Нямеччыне ажно 16 удзельнікаў нядаўна мінулай алімпіяды. Было б і больш, але браты Касціцыны сенсацыйна затрымаліся разам з „Манрэалем" у Кубку Стэнлі, дайшоўшы там ужо да паўфіналу. Такую ж стабільнасць у складзе выявілі дружыны Нарвегіі (16 алімпійцаў), Латвіі і Расіі (па 14). А вось у зборных ЗША і Канады толькі па адным хакеісце гулялі ў Ванкуверы, у Швецыі і Славаччыны — па 3, Фінляндыі — 4. Адчуваеце розніцу? На практыцы такая ратацыя азначае, што гэтыя краіны, у адрозненне ад Беларусі, могуць выставіць некалькі ці нават шмат канкурэнтна здольных каманд.

На гэтым чэмпіянаце хакеістаў беларускай зборнай няма ў чым папракнуць. Яны змагаліся напоўніцу і саступалі з боем, захаваўшы на выніковым табло досыць прыстойныя лічбы. Мяркуйце самі — 2:4 ад Славаччыны, 1:3 ад Расіі, 0:2 ад Фінляндыі выглядаюць годна. Пры тым не толькі статыстыкам кідаецца ў вочы, што ў гэтых сустрэчах нашы правалілі другія перыяды (усе па 0:2) і былі бездапаможныя ў рэалізацыі колькаснай большасці (адным з вызначальных кампанентаў сучаснага хакея).

Сустрэча з немцамі для беларускіх майстроў клюшкі была вызначальнай. У першым перыядзе шайбу закінуў Андрэй Міхалёў, у другім галоў не было. Зноў нашы транжырылі колькасную перавагу, зноў гераічна гуляў у брамцы Андрэй Мезін. Але на апошняй хвіліне асноўнага часу немцы, маючы вялікую перавагу, заканамерна параўнялі лік — 1:1. У авертайме вырашальны стрэл здзейсніў Аляксей Калюжны — 2:1 выйгралі беларусы. Але рэдкі выпадак калі зыходам засталіся засмучаны абодва бакі. Рэч у тым, што Беларусь страціла шанцы на выхад у плэй-оф. Становішча ў групе было такім: Расія — 12 ачкоў, Данія і Фінляндыя — па 6, Нямеччына — 4, Славаччына — 3, Беларусь — 2. У аўторак у нашых была апошняя на чэмпіянаце гульня з Даніяй. Матч прэстыжу і не больш.

Так што трывала трапіць у вялікую хакейную васьмёрку (Канада, Швецыя, Расія, ЗША, Фінляндыя, Чэхія, Славаччына і Швейцарыя) бліжэйшым часам Беларусі ніяк не ўдасца. Туды нашы могуць заскочыць толькі эпізадычна пры шанцаванні і спрыянні розных фактараў. Больш таго, чэмпіянат выразна паказаў, што клас такіх дружын як Нямеччына і Данія значна вырас. І як бы тупанне на месцы (урэшце быць у дзесятцы мацнейшых зборных свету таксама пачэсна) не перайшло ў адступленне назад.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Каб лепш пазнаць сябе

Тэкст і фота Міхася СЦЕПАНЮКА

Радова — маленькая вёсачка ў чатырох кіламетрах ад шашы Мрангова — Ольштын. Якраз тут у мазурскім паселішчы знаходзіцца Міжнародны цэнтр моладзевых сустрэч. У гэтым жа цэнтры прайшла сустрэча моладзі з Польшчы і Літвы, арганізаваная Звязам беларускай моладзі.

— Галоўная мэта праекта — гэта сустрэча маладых людзей з Польшчы і Літвы, — сказаў Міхал Троц, сябра ЗБМ. — На працягу шасці дзён размаўляем пра нацыянальныя меншасці ў Польшчы і Літве, высвятляем іх сітуацыю ў абодвух краінах.

Паколькі тэма праекта „Роўныя ў разнароднасці — нацыянальныя меншасці ў калейдаскопе" прымеркаваная да нацыянальных меншасцей, у сустрэчы прынялі ўдзел маладыя беларусы, палякі ды немцы з Польшчы ды літоўцы, беларусы і палякі з Літвы. Усяго — 23 маладых людзей.

— Хаця тэма сустрэчы даволі сур'ёзная, заняткі стараемся весці ў атракцыйны для маладых людзей спосаб, — патлумачыла Катажына Бласіньска з фонду „Радова". — Няма тут школьных дакладаў, урокаў, затое ладзяцца майстар-класы, праца ў міжнародных групах ды інтэграцыйныя гульні.

Менавіта міжнародная інтэграцыя, азнаямленне з іншымі культурамі — гэта таксама вельмі важныя мэты праекта. Усё дзеля таго, каб моладзь з Польшчы і Літвы магла лепш пазнаць адзін аднаго, нярэдка змяніць свае стэрэатыпы аб прадстаўніках іншых народаў.

— Мне найбольш падабаецца інтэграцыя прадстаўнікоў розных культур, — сказаў мне Давід Яблушэўскі з Бельскага белліцэя. — Можам вельмі добра пазнаць адзін аднаго такімі, якімі мы з'яўляемся ў сапраўднасці, без ніякіх прадузятасцей.

Хаця атмасфера падчас праекта вельмі свабодная, высвятляліся тут вельмі важныя і актуальныя для нацыянальных меншасцей тэмы — захаванне нацыянальнай тоеснасці, двухмоўныя ўказальнікі, прозвішчы на роднай мове. Закраналіся таксама супольныя элементы гісторыі Польшчы і Літвы.

— Вялікае ўражанне на ўсіх нас выклікаў візіт у Пуньску, — сказаў Міхал Троц. — Удзельнікі праекта маглі самі пераканацца, што гэта такое двухмоўнасць, пабачыўшы шыльды на дзвюх мовах у крамах, на вуліцах. У адзін момант у краме я быў адзінай асобай, якая не размаўляла па-літоўску.

Цікава, што ў Пуньску падчас абеду ў лакальным рэстаране магло здавацца, што гэта не літоўцы прыехалі у Польшчу, але наадварот.

Важным элементам сустрэчы былі таксама вечарыны падрыхтаваныя ўдзельнікамі праекта, прысвечаныя літоўскай ды польска-беларускай культуры. У час літоўскага вечара прадстаўлена была Літва, яе гісторыя. Былі таксама літоўскія страва і народныя гульні. Удзельнікі з Польшчы прадставілі кароткую інсцэнізацыю вяселля з польскімі і беларускімі элементамі.

Шасцідзённы праект завяршыўся падрыхтоўкай міжнароднымі групамі малых праектаў, якія мелі закранаць тэму нацыянальных меншасцей, стэрэатыпаў ды проста расказаць аб пабыўцы моладзі ў Радове. Паўстаў кароценькі фільм, тэатральная п'еса, комікс ды нават інтэрнэт-блог.

— За гэтыя 6 дзён мы даведаліся аб сабе намнога больш, чым чытаючы гістарычныя падручнікі, гледзячы тэлебачанне ды чытаючы газеты, — сканстатаваў праект Міхал Троц.

Праект „Роўныя ў разнароднасці — нацыянальныя меншасці ў калейдаскопе" зрэалізаваны быў 3-9 траўня, дзякуючы падтрымцы польска-літоўскага фонду абмену моладдзю.

Літаратурныя падарожжы

(польскамоўныя пісьменнікі на Берасцейшчыне)

VI

Імя Марыі Канапніцкай успамінаем, праязджаючы па месцах, звязаных з Марыяй Родзевіч і Элізай Ажэшка. Пісьменніца сябравала з гэтымі прадстаўніцамі польскай літаратуры, час ад часу прыязджаючы на Берасцейшчыну.

На год маладзейшая за Элізу, яна пазнаёмілася з ёю ў час вучобы ў пансіёне ў Варшаве. З тае пары яны сябравалі, а, сустрэўшыся, падарожнічалі разам па Піншчыне і Драгічыншчыне, аб чым чытаем у яе лістах у Варшаву: „Старонка цікавая, упершыню з ёю знаёмлюся. Падабаецца вельмі. Пінск і Піншчыну трэба аглядаць вясною, калі шырока і далёка разліваецца вада. Але і цяпер, восенню, цікавіць мяне гэтая ваколіца. Ваколіца і людзі. Край змяніўся, пазбавіўся былых прыкметаў, вады стала менш, лясы высеклі, значная частка земляў — у руках рускіх".

У наступным лісце пісьменніца дзеліцца сваімі ўражаннямі ад пінчука: „Пінчук заўсёды застаецца тым самым, тыпова худы, чарнявы, брудны, фанабэрысты і бедны. Заўсёды на плячах ён носіць тую ж самую торбу з куском чорнага хлеба і салёным агурком, заўсёды пляце лапці і апранаецца ў саматканую світку".

Наколькі непаўторнае ўражанне на пісьменніцу зрабіла знаёмства з Піншчынай, сведчыць адно з лепшых яе апавяданняў — „З узломам".

Дзеянне твора адбываецца ў галодны год у Пінску, калі хлеба няма ў нікога. Год быў цяжкі, ураджай кепскі, бульба пагніла, авёс счарнеў, ячмень засох, нават лебяда не ўдалася, была горкай і чарвівай".

Марыя Канапніцкая рэдагавала дэмакратычны часопіс для жанчын, куды час ад часу дасылала свае лісты Марыя Родзевіч. А ў 1889 годзе па запрашэнні гаспадыні з Грушава пісьменніца прыязджае на Кобрыншчыну, каб пазнаёміцца з гэтым краем праз падарожжы і сустрэчы.

У 1906 годзе Марыя Канапніцкая скончыла самы буйны са сваіх твораў — паэму „Пан Бальцар у Бразіліі". Яна прысвечана тэме эміграцыі.

З вуснаў галоўнага героя чуюцца назвы паселішчаў, размешчаных па абодва бакі ракі Буг. А старонкі паэмы, прысвечаныя Астапчуку Луцю, суправаджаюцца геаграфічнымі назвамі Берасцейшчыны: Пінск, Лагішын, рака Мухавец, канал Агінскага, Пінскія балоты. Адчуваецца, што на старонкі твора перанесены ўражанні ад падарожжаў па Берасцейскай зямлі.

„Вялікай пясняркай-княгіняй" назваў Марыю Канапніцкую Янка Купала ў вершы, прысвечаным яе памяці.

(працяг будзе)

Тамара ЛАЎРАНЧУК

г. Высокае

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Марыі Эшанбах.

1. пах = 8 _ 9 _ 33 _ 11 _ 16 _;
2. няшчасце = 6 _ 18 _ 10 _ 7 _;
3. уліваецца ў Дняпро ў Рагачове = 14 _ 3 _ 2 _ 12 _ 13 _;
4. бог холаду ў языніцкай міфалогіі ўсходніх славян = 32 _ 40 _ 24 _ 39 _;
5. любіць узяць = 34 _ 35 _ 41 _ 42 _;
6. хімічны элемент In = 5 _ 4 _ 1 _ 20 _ 36 _;
7. таўкатня, сумятня = 26 _ 30 _ 19 _ 15 _ 37 _ 38 _ 29 _;
8. мача = 25 _ 22 _ 28 _ 27 _ 23 _;
9. мангольскі ўладар = 31 _ 21 _ 17 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 16 нумара

Адліў, ажур, Гаіці, гід, дзед, Ілі, каўнер, медзь, міліцыя, Поці, пояс, сэт, Цюрых.

Рашэнне: **Рэлігіі існуюць дзеля падрыхтоўкі да смерці і дзеля дапамогі ў жыцці.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Дзядоўскае турнэ з Анатолем С. (19)

Светлай памяці журналіст Альгерд Невяроўскі ўмеў цудоўна пажартаваць з надта частай прысутнасці ў беларускай мове прыметніка «цудоўны». Асабліва бавілі яго такія спалучэнні як «цудоўнае беларускае надвор'е» або «цудоўныя людзі-беларусы», бо дзеля першага — даказваў ён — мы вымушаны перціся ў Крым, а дзеля другога — на могілкі.

* * *

Мала калі ў жыцці, на хаду, аналізуем недарэчныя гутаркі, якія без толку ўбіваюцца ў размову і ад якіх застаецца пачуццё прэтэнцыёзнасці. Год да сваёй смерці Альгерд пальнуў такое: *Я таксама як Сыс скончыўся без пары!* Тое, што прамовіў пра сябе ў мінулым часе, здалося тады граматычнай памылкай. Як жа скончыўся? Чалавек сядзіць сабе як Радзівіл з куфлем піва ў кавярні, смяецца ледзь не лопне і, раптам, такая замагільшчына! Нашыя беластоцкія бяседы з Альгердам звычайна кружылі вакол літаратурных тусовак. Ён, як мала хто, быў азнаёмлены з літаратурнымі (ды не толькі) легендамі беларускай сталіцы. Сам, дарэчы, пух ад настальгіі па Мінску і старой кампаніі. Не дзіва, што кожны ўспамін пра Анатоля Сыса дзейнічаў як добрая псіхатэрапія і натхненне для чарговага працадня ў заробленым як конь Беластоку. Альгерд любіў пераўвялічаныя гісторыі, асабліва тыя прыдуманыя, пра якія ніхто апрача расказчыка не ведаў і не чуў, нават сам герой. За гісторыю пра тое як Анатоль Сыс пагнаў нас у магазін па віно, ён быў гатовы не толькі пачаставаць вядром сухога віна, але і занесці на сваіх плячах дахаты. Паціху, як і мы, сам займаўся крыптапрамоцыяй Анатоля Сыса ў СМІ. Некалькі дзён да згаданай бяседы ён прачытаў у эфіры Радыё Рацыя звестку пра ўсталяванне помніка на магіле паэта ў Гарошкаве. Але не толькі гэта дазваляла камунікаваць на падобных хвалях. Альгерд навіны аздабляў літаратурнымі цытатамі, сам з памяці чытаў вершы, прытым тыя найлепшыя. І, як не дзіўна, гэта гучала свежа і верагодна, без пафасу і без нудоты, амаль як факты.

* * *

Пасля прыезду з Гарошкава ў Мінск мы дамовіліся з'ездзіць у нядзелю на магілу Альгерда разам з яго маці. Спадарыня Эльвіра Невяроўская так і не дачакалася нас у назначаным месцы і часе. Вінаватая айчынная метафізіка! У літаратурнай кватэры Шніпоў, дзе папрасіліся мы на начлег, пасля поўначы нешта грукнула. Здавалася, развалілася сцяна або столь або адна з нас грымнула з ложка! Раніцай высветлілася іншае — ноччу абвалілася кніжная сценка ў нашым пакойчыку. Калі гаспадар зірнуў на кучу паваленай літаратуры, ён доўга не мог прамовіць слова. Наверсе кніжнай гурбы ляжала картка з вершам Людмілы Рублеўскай: *Памяці Анатоля Сыса (За чырвонай шторай дагарае свечка...)*. Не дзіва, што пасля начнога сеанса мы пачалі думаць, а дакладней таптаць як жанчынкі з глыбінкі. Спачатку мы згубілі арыентацыю ў прасторы і заблудзілі ў знаёмым месцы. Замест на прыпынак, з якога адпраўляюцца аўтобусы ў Калодзішчы і дзе чакала нас спадарыня Эльвіра, мы пацягнуліся ў супрацьлеглы бок Мінска, дзесьці пад мост. Праз вокны аўтобуса мы пабачылі (і сфатаграфавалі) шэсце пад бел-чырвона-белымі сцягамі. На фоне заспанага горада яно выглядала як з'ява з іншага свету. Ды ніхто з пасажыраў не пракаментаваў у голас самавітай карціны. Быццам толькі мы адны бачылі тое дзіва. Як пасля аказалася, мы мінуліся з дзядоўскім шэсцем у Курапаты. Тыя, што ішлі ў калоне пад сцягамі, быццам змовіліся з Мірай Лукшай і Ганнай Кандрацюк. Удзельнікі шэсця неслі ў Курапаты бел-чырвона-белы вянок, прысвечаны між іншым светлай памяці Альгерду Невяроўскаму. Мы ў сваю чаргу везлі падобныя патрыятычныя букеты хрызантэмаў і знічкі з Жыровіч, купленыя на мінскім чыгуначным вакзале.

Фота Міры ЛУКШЫ

Басовішча-2008, Альгерд Невяроўскі з аўтаркай

* * *

Магілу Альгерда Невяроўскага мы адшукалі з дапамогай адміністрацыі пагоста і іхняга разумнага сабакі, які, як GPS-маніторынг, выбег з будынка ў пажаданы нам бок.

— Это *тот* журналіст? — упэўніўся яшчэ малады мужчына, найхутчэй кіраўнік некраполіі. Яго сябры, таксама яшчэ маладыя мужчыны, глянулі на нас як на цётак з сузор'я Арыён.

— Тот! — адказалі мы ў адзін такт на пытанне.

Каб не згубіцца сярод магіл, кіраўнік кладзьбішча запісаў нам на картачцы каардынаты магілы: *Уч. 149 ряд. 3 м. 28*. Без ягонага лістка мы і за год не знайшлі б патрэбнай магілы. Некраполія ў Калодзішчах уражвае гіганцкімі памерамі, блізнючым падабенствам магіл і помнікаў ды нейкай адчайнай самотнасцю і бязладдзем. Нас крыху здзівіла, што наш калега, па адукацыі гісторык і каталіцкі клірык, пахаваны сярод праваслаўных. Стоячы над яго свежай магілай, аздобленай гурбой бел-чырвона-белых вянкоў (між іншым ад Радыё Рацыя), нам не хацелася думаць пра ягоную недарэчную і заўчасную смерць. Здаецца і сам Альгерд не хацеў гэтага. Згодна з традыцыяй нашага дзядоўскага турнэ мы праспявалі Альгерду «На вуліцы мокра», налілі яму чарку і запалілі знічкі. Наш жэст быў прыкмечаны ў лепшым свеце. Праз сорак хвілін мы пабачым у мінскім метро мужчыну капля ў каплю як наш цудоўны калега-жартаўнік. Двайнік Альгерда кідаўся ў вочы з-за дзівосных апранах у розных размерах і стылях у модзе і часе. (Альгерда спапялілі, таму, мабыць, ён быў вымушаны на ляту пазычаць вопратку ад калег з таго свету). Сімпатычная здань у скураным плашчы і расцягнутым шведрыку спачатку сакрэтна спазірала ў наш бок, а пасля, калі мы выйшлі з вагона і накіраваліся да выхаду, стралой апярэдзіла нас на нейкія дзесяць метраў і безупынна азіралася, каб пасля, калі выйдзем на паверхню Мінска, растаяць бясследна ў дзённым святле.

Маючы ў галаве «Дамавікамерона» ды «Здані і пачвары Беларусі» мы пабаяліся азірацца на мінскае метро, месца, дзе, як нідзе ў свеце (паводле аўтараў названых крыніцкніг) здольна матэрыялізавацца любая замагільшчына.

23.05 — 29.05

(22.03. — 20.04.) У пачуццях спрыяе Венера. Чакае цябе эмацыянальная рэвалюцыя! Агорне цябе шалёная патрэба змен. Ідэальны час на інвеставанне ў дом. 28.05. адкрыюцца новыя магчымасці, будзеш мець вельмі арыгінальныя ідэі і шанцы, якія шкада было б страціць.

(21.04. — 21.05.) 23-26.05. пазбягай падарожжаў, бо нават запланаваныя і чаканыя могуць аказацца быць вельмі непрыемнымі. Малая схільнасць да кампрамісу. Затое можа ўдацца рамонт. Цяжкія выклікі; калі ўсё ўдасца, тым больш будзе вялікая радасць.

(22.05. — 22.06.) Ажывішся ў фінансах. Добры час на навуку (добры прагноз для матурыстаў!). Нечакана пашырыцца кола знаёмых. Малавядомая асоба, можа пакуль несімпатычная, аказацца быць вельмі файнай. Перфекцыянізм на працы стоміць цябе і будзеш нервовы. 28.05., у час поўні Месяца, цяжка будзе захаваць табе спакой; спрэчка з блізкай асобай можа блага кончыцца!

(23.06. — 23.07.) Можа прытрапіцца табе любоўная прыгода як са старых раманаў. Твой абранец закахаецца без памяці! А і ты будзеш акрылены. У час поўні Месяца 28.05. знервуе цябе асоба, з якой працуеш. Можаш сказаць пару лішніх слоў. На працы малая рэвалюцыя. Запрагнеш змен, за якія раней не ўзяўся б. Настрой вясёлы, бадзёры, але патрэбны табе адпачынак у хатнім заціішшы.

(24.07. — 23.08.) Злосны Уран схоча папсаваць табе рахункі. Можаш пазнаёміцца з кімсьці, з кім знойдзеш агульную мову. Можаш справіцца з эмоцыямі ад няздзейсненага пачуцця. У бізнесе змагайся за сваё.

(24.08. — 23.09.) Добры час на супольныя сустрэчы. Спадабаецца табе хтосьці таямнічы, прываблівы і самаўпэўнены. Можа прытрапіцца табе вельмі цікавая ідэя, але яе пакуль яшчэ не рэалізуй. Трымай язык за зубамі. У час поўні Месяца правалам могуць кончыцца твае спробы паразумення з бацькамі. Абмінай бары.

(24.09. — 23.10.) Зварот у кампанейскім жыцці. Не ўмешвайся ў спрэчкі, бо могуць цябе ўцягнуць у сур'ёзны канфлікт. Неспадзяваныя выдаткі не дадуць табе нацешыцца грашыма. Добрая форма, ды варта над ёю папрацаваць; змабілізуешся!

(24.10. — 22.11.) 23-26.05. — цяжкі час у пары; могуць надысці „ціхія дні"! Варта ўкласці крыху пачуцця ў новае знаёмства. Неаформленыя справы пойдуць у добрым напрамку. Скарпіёнам, народжаным пасля 16.11., раман можа аказацца пасткай! Падумай аб змене занятку або новым ладзе на працы.

(23.11. — 22.12.) Нойдуць на цябе наватарскія ідэі і зразумееш тое, што было няяснае. Самотны Стралец няхай паддасца ачараванню! Не выказвайся аб тым, чаго не ведаеш. Шанцы паправіць старыя памылкі. Ашчаджай сілы, не перагружвай арганізма. Да 25.05. апусціш нос; не падай духам і кіруйся здаровым розумам.

(23.12. — 20.01.) Падумай пра сябе, — мусіш адпачыць, знайсці час на хобі, салодкую ляноту. Да 25.05. — час неспакою. Не дайся справакаваць на працы. Рамантычныя хвіліны ў пары, вяртанне добрых эмоцый і ўспамінаў. Казярогі, народжаныя перад 29.12., маюць шанц зарабіць немалыя сумы.

(21.01. — 19.02.) Вадалеі народжаныя пасля 15.02.: не кідайцеся на глыбокую ваду — яшчэ не да канца гатовыя чаканыя змены. Хто каго любіць — той таго чубіць; гарачыя жарсці. Бараны, Ільвы і Шалі будуць цябе падахвочваць да адважных прыёмаў. 28.05. будзеш моцны, поўны аптымізму; аформіш усе цяжкія справы.

(20.02. — 21.03.) Не прадбачваюцца катастрофы, ды можаш згубіць дарогу. 28.05. лішак энергіі можа пахіснуць тваю раўнавагу. У апошнія дні адчуеш адплыў энергіі, ды не дасі рады спавольніць тэмп. У прафесійным плане ступаеш па крохкім лёдзе. Зважай на людзей, з якімі працуеш.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960